

ЗНАЙСЦІ ПРЫЗВАННЕ НА ЗЯМЛІ

МС

РЫЦАРСТВА ДЛЯ СУЧАСНІКАЎ 5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ЖНІЎНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 157 (29271)

9-24 стар. +TVПРАГРАМА МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Павел КАЛАУР, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Бюджэтныя меры працягнуць аказваць падтрымку беларускай эканоміцы. Гэта будзе спрыяць пераадоленню прадпрыемствамі і насельніцтвам наступстваў пандэміі, паступоваму аднаўленню сукупнага попыту. Чакаецца, што ў найбольшай ступені стымулюючы эфект ад мер бюджэтнай палітыкі праявіцца сёлета».*

# Хлебны дождж



Вядучы аграном сельгаспрадпрыемства «Рудакова» Віцебскага раёна Настасся БАЙКО.

## КОРАТКА

- **Другая партыя амерыканскай нафты пачала паступаць на «Нафтан».**



- Мінпрыроды Беларусі ў I паўгоддзі перадало ў распрацоўку 12 радовішчаў.
- **Названыя пераможцы Нацыянальнай літаратурнай прэміі.**
- «Івацэвічдрэў» запусціў новую лінію па выпуску мэблі.
- **Мінэканомікі ініцыюе падаўжэнне тэрміну дзеяння ўказа аб падтрымцы эканомікі.**
- Аб'яўлены конкурс на атрыманне прэміі СНД у галіне якасці.
- **У Беларусі засталося ўбраць менш за чвэрць плошчаў збожжавых.**
- Музей мёду з'явіўся ў Бярэзінскім запаведніку.



ISSN 1990 - 763X
20157

Працяг тэмы

# ПАЛЯВАННЕ НА ВЕЧНАСЦЬ

### У Магілёве абмеркавалі праблему захавання старадаўніх помнікаў

**Старадаўнія могілкі, упрыгожаныя бронзавымі скульптурамі і літымі металічнымі надмагіллямі, не раз станавіліся прадметам спажывы. Толькі сёлета ў Магілёве былі знішчаны некалькі надмагілляў, сярод якіх пліта чыгуннага ліцця Рыгора Грум-Гржымайлы — граданачальніка Магілёва пачатку XIX стагоддзя, дзеда і поўнага цёзкі знакамітага даследчыка Цянь-Шаня і Паміра («Звязда» пісала пра гэта ў нумары ад 25 чэрвеня).**

**На жаль, у краіне не існуе адзінага алгарытму, як абараніць старадаўнія помнікі. І ў Магілёве вырашылі заняцца гэтым пытаннем на лакальным узроўні. Дэпутат Магілёўскага гарсавета Галіна БЯЛЯЕВА і дырэктар музея гісторыі Магілёва Аляксей БАЦЮКОЎ выступілі арганізатарамі круглага стала, прысвечанага набалелай тэме. У абмеркаванні праблемы ўзялі ўдзел дэпутат Магілёўскага гарсавета Раман КРЫВАШЭЕЎ, член міжнароднага грамадскага аб'яднання «Экапраект» Віктар КІРЭЕЎ, прадстаўнік яўрэйскай суполкі Аляксандр ЛІЦІН, старшы інспектар упраўлення культуры Магілёўскага гарвыканкама Наталля ІГНАЦЦЕВА, прадстаўнікі Магілёўскай епархіі Таццяна БАРЫСЕНКА і Марына КАЛЬЧЫБА, скульптар Андрэй ВАРАБ'ЁЎ.**



СТАР. 7

Прыкметы часу

# ДРУГАЯ РАБОТА

## Дзе падпрацоўваюць беларусы?

**«Каб ты жыў на адну зарплату!» — жартоўны праклён са старой савецкай камедыі гэтым летам актуальны як ніколі. На адну зарплату многім выжыць складана. Застаецца шукаць падпрацоўку.**

Гібкі графік, работу на ноч або на выхадныя ў большасці выпадкаў варта шукаць у прыватным сектары эканомікі. Дзяржпрадпрыемствы аддаюць перавагу пастаяннаму штатнаму раскладу і звычайнаму рабочаму дню. Падпрацоўку людзі часцей за ўсё шукаюць не па спецыяльнасці, аднак нярэдка і ў той сферы, дзе яны — прафесіяналы.

### ДАРЫ ПРЫРОДЫ

Традыцыйная падпрацоўка сельскіх жыхароў з чэрвеня да кастрычніка — дары лясоў і садавінаагародніна, якую вырасцілі на прысядзібных участках. Дары прыроды прымаюць у спецыяльных пунктах і прадаюць уздоўж трас ці на міні-рынках у бліжэйшых гарадах. Прадаўцы, як правіла, — жанчыны пенсійнага ўзросту. Лясныя ягады і грыбы — таксама традыцыйны летні прыробак беспрацоўных і ўвогуле людзей, што апынуліся ў складаных жыццёвай і фінансавай сітуацыях. Падпрацоўка гэта не надта прыбытковая, яна патрабуе ведання грыбных і ягадных месцаў і фізічнай нагрузкі. У дзень зарабіць можна прыкладна 20–40 рублёў.

СТАР. 4

З першых вуснаў

# «Ад надзейнасці паліўна-энергетычнага комплексу залежыць наша нацыянальная бяспека»

**Пра гэта Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў учора ў Палацы Незалежнасці на нарадзе па актуальных пытаннях паліўна-энергетычнага комплексу краіны.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што хоча атрымаць поўную карціну і сённяшняй работы, і перспектыў развіцця гэтага стратэгічнага для краіны кірунку.

«Ад яго надзейнасці і магутнасці залежыць уся эканоміка Беларусі і наша нацыянальная бяспека, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Гэта паказалі падзеі канца мінулага і пачатку гэтага года, калі мы вымушаныя былі змагацца за лыжку нафты і кубаметр газу. Якіх, дарэчы, сёння на рынку бяры не хачу. Дзяржава ўклала нямала сродкаў у мадэрнізацыю энергетыкі. І сёння прадпрыемствы энергасістэмы, у тым ліку нафтаперапрацоўчыя заводы, па тэхнічным, тэхналагічным забеспячэнні знаходзяцца на такім жа ўзроўні, што і вядучыя еўрапейскія дзяржавы».

Цяпер у Беларусі рэалізуецца найбуйнейшы, па словах Прэзідэнта, інвестыцыйны праект у яе гісторыі — узводзіцца Беларуская атамная электрастанцыя. Будаўніцтва першага энергаблока завершана, у рэактар загружаныя касеты з палівам, паведаміў кіраўнік дзяржавы. Наперадзе яшчэ адзін найважнейшы, па яго словах, этап — уключэнне АЭС у энергасістэму краіны і выхад першага энергаблока на поўную магутнасць.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў уключыць у яго рабочы графік наведванне БелАЭС і ўдзел у яе запуску.

На завяршальнай стадыі мадэрнізацыя двух беларускіх нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў — «Нафтана» і Мазырскага НПЗ.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў міністра энергетыкі далажыць, наколькі гатова адпаведная інфраструктура да работы ў новых умовах, распытаў пра прагнозы па тарыфах: наколькі яны знізяцца для ўсіх катэгорый спажыўцоў?

Старшыню канцэрна «Белнафтахім» Прэзідэнт спытаў пра прагнозы па пастаўках і перапрацоўцы нафты да канца гэтага і пра планы на будучы год, пра развіццё альтэрнатыўных паставак у Беларусь нафты і прыроднага газу. У парадку дня нарады таксама пытанні развіцця інфраструктуры для захоўвання запасаў нафты і нафтапрадуктаў, будаўніцтва перамычкі паміж НПЗ, іх мадэрнізацыя.

«У нас прапісаныя канкрэтныя тэрміны, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.




— На «Нафтане» ўжо праз месяц павінна быць атрымана новая прадукцыя. Хацеў бы ўбачыць гэту прадукцыю асабіста. На Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе ў той жа час павінны завяршыцца сварачныя і мантажныя работы на трубаправодах высокага ціску. Як тут абстаяць справы?»

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся рэалізацыяй Стратэгіі развіцця нафтахімічнага комплексу да 2030 года, у выніку якой глыбіня перапрацоўкі нафты павінна павялічыцца да 90 працэнтаў, выхад светлых нафтапрадуктаў — да 65–70 працэнтаў, вытворчасць бензінаў — на 620 тысяч тон, дызельнага паліва — на 1430 тысяч тон. Чакаецца, што праекты, уключаныя ў Стратэгію, дазволяць таксама павялічыць выпуск азотных угнаенняў у 1,7 раза ў дзеючым рэчыве, фосфарных — у 1,4 раза, хімічных валокнаў і нітак — на 45 працэнтаў, нятканых матэрыялаў — на 83 працэнты, лакафарбавых матэрыялаў — больш чым на 17 працэнтаў, шкловалаконнай прадукцыі — больш чым на 11 працэнтаў.

На нарадзе абазначаныя пытанні і ўраду: куды будзе накіраваны дадатковы аб'ём электраэнергіі, які хутка з'явіцца ў краіне?

«Каранкевіч вырабіць нам электрычную энергію — хто яе купіць і як будзем выкарыстоўваць? Якія перспектывы экспарту электрычнай энергіі? — звярнуўся да прысутных Аляксандр Лукашэнка. — І другое пытанне ўраду: што вы збіраецеся рабіць з праблемнымі прадпрыемствамі канцэрна? Не буду іх называць, вы іх ведаеце».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ❍ У ТЭМУ:

«На Беларускай атамнай электрастанцыі на першым блоку 7 жніўня распачата загрузка свежага ядзернага паліва ў актыўную зону рэактара, сёння (13 жніўня. — **«Зв.»**) гэта работа павінна быць завершаная, усе 163 цеплавылучальныя зборкі павінны быць загружаныя — паведаміў **журналістам міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ.** — Далей — гэта ўжо зборка рэактара, яго ўшчыльненне і выхад на мінімальную магутнасць работы. У чацвёртым квартале плануюцца ўключэнне абсталявання ў сетку і выдача электрычнай энергіі ў энергасістэму для спажыўцоў».

Міністр дадаў, што ідзе работа па павелічэнню спажывання электраэнергіі ў краіне. Яна ўключае будаўніцтва і ўстаноўку электракатлоў сумарнай магутнасцю 916 мегават для ацяпляльнай сістэмы, развіццё электратранспарту (сёлета за першае паўгоддзе спажыванне электраэнергіі тут дасягнула ўзроўню ўсяго мінулага года) і рэалізацыю міжгаліновага комплексу мер па павелічэнні электраспажывання ў рэальным сектары эканомікі (на 2,7 мільярда кілават-гадзін у параўнанні з мінулым годам).

«Цяпер міністэрства энергетыкі разам з МАРГам прапрацоўвае сістэму стымулюючых тарыфаў у залежнасці ад аб'ёмаў спажывання: чым вышэйшы аб'ём, тым, адпаведна, будзе меншы тарыф, — растлумачыў Віктар Каранкевіч. — Такую работу мы плануем завяршыць да канца года».

Насельніцтва за шэсць месяцаў гэтага года выкарыстала 40 мільёнаў кілават-гадзін электраэнергіі для ацяплення сваіх дамоў і падагрэву вады — гэта ўтрая больш, чым за ўвесь мінулы год. Меры стымулявання — адмысловыя тарыфы і кампенсаванне дзяржавай часткі сродкаў, якія людзі накіроўваюць на пераабсталяванне жытла для гэтых мэт.

«Цяпер прапрацоўваецца прынясце дадатковых дакументаў: праект указа па павелічэнню вяртання выдаткаў на электразабеспячэнне жылых дамоў для абагрэву ў дачыненні да сацыяльна ўразлівых катэгорый грамадзян і магчымасць выкарыстання ўласных сродкаў грамадзян на рэканструкцыю электрычных сетак», — паведаміў міністр.

**Старшыня Беларускага дзяржаўнага канцэрна «Белнафтахім» Андрэй РЫБАКОЎ** дадаў: «У другім паўгоддзі мы перапрацуем на тры мільёны тон нафты больш, чым у першым, і гэта нават на адзін мільён тон больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года».

Агульная лічба па годзе будзе не меншая за 16-16,5 мільёна тон, удакладніў ён.

Суразмоўца запэўніў, што загрузка нафтаперапрацоўчых заводаў («Нафтан» цяпер спынены на планавы рамонт, працуе мазырскі НПЗ) стабільная і залежыць ад рынкаў збыту.

«Нейкай праблематыкі ў забеспячэнні нафтай няма, мы праглядаем пастаўкі да канца года, пры гэтым працягваем на сістэмнай і пастаяннай аснове работу па альтэрнатыўнай нафце, — дадаў кіраўнік канцэрна. — Сёння (13 жніўня. — **«Зв.»**) ужо прыходзіць па чыгунцы першая партыя амерыканскай нафты новага гатунку, будзем яе перапрацоўваць, вывучаць, глядзець усе яе перавагі і недахопы. Такая работа працягнецца. У тым ліку на Мазырскі НПЗ па трубаправодзе Адэса — Броды на пастаяннай аснове паступае альтэрнатыўная нафта».

Па выніках года доля альтэрнатыўнай нафты складзе не менш за 10 працэнтаў, дадаў ён.

Вызначаны планы па фарміраванні паставак нафты на 2021 год, перагаворны працэс ужо ідзе як з расійскімі пастаўшчыкамі, так і з кампаніямі іншых краін, праінфармаваў Андрэй Рыбакоў.

«Унутраны рынак забяспечваўся і будзе забяспечвацца ў поўным аб'ёме, пры гэтым у нас паліва самай высокай еўрапейскай якасці», — рэзюмаваў ён.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Чэхіі і Славакіі другая хваля эпідэміі



У Чэхіі і Славакіі ў апошнія тыдні сур'ёзна ўскладнілася санітарна-эпідэміялагічная сітуацыя. У гэтых краінах кажуць пра пачатак другой хвалі пандэміі, паведамляе ТАСС.

Па стане на чацвер колькасць заражаных каранавірусам у Чэхіі за час пандэміі перавысіла 19 тысяч. За мінулыя пяць з паловай месяцаў ад ускладненняў, выкліканых вірусам, памёр 391 жыхар рэспублікі, 13 407 ачунялі. За мінулыя суткі медыкі выявілі ў краіне 292 інфіцыраваных каранавірусам. У папярэдні дзень у краіне было зафіксавана 288 новых выпадкаў заражэння.

У Чэхіі, насельніцтва якой складае 10,7 мільёна чалавек, на цяперашні момант налічваецца 5277 пацыентаў з каранавірусам. Гэта найбольшы паказчык з пачатку пандэміі. Большасць з іх лечыцца ва ўмовах хатняй самаізаляцыі. З ускладненнямі шпіталізаваны 131 хворы, стан 24 з якіх медыкі ацэньваюць як цяжкі.

У сувязі з пагаршэннем санітарна-эпідэміялагічнага становішча ў Чэхіі абмежаванні на ўезд яе жыхароў аднавілі некалькі краін Еўропы. Сярод іх Славенія, Фінляндыя, Нарвегія, Ірландыя, Сербія, Боснія і Герцагавіна. З 17 жніўня чэхам спатрэбяцца даведкі аб адмоўных выніках тэстаў на вірус па прыбыцці ў Грэцыю.

Міністр аховы здароўя Славакіі Марэк Крайчы заявіў, што краіна ўжо перажывае другую хвалю пандэміі каранавіруса новага тыпу.

## У Каліфорніі зноў пажар

Прыродны пажар успыхнуў у амерыканскім штаце Каліфорнія, агнём ахоплена каля чатырох тысяч гектараў, паведамляе NBC.

Распаўсюджванню агню спрыяюць сухое надвор'е і моцны вецер. У тушэнні ўдзельнічаюць больш за 500 супрацоўнікаў пажарнай службы.

Мясцовыя ўлады ўжо распарадзіліся эвакуіраваць жыхароў каля 100 дамоў, размешчаных непасрэдна каля лініі агню. Часовы эвакуацыйны пункт для людзей быў арганізаваны ў адной са школ горада Палмдэйл. Аднак з-за абмежаванняў, звязаных з каранавірусам, эвакуіраваных людзей у будынак школы не пусцілі, прапанаваўшы заставацца ў сваіх аўтамабілях на школьнай паркоўцы.

Прычына пажару пакуль не ўстаноўлена, звестак пра пацярпелых не паступала.

## Бейрут можа страціць культурныя аб'екты назаўжды

Сама меней 601 будынак, які з'яўляецца аб'ектам культурнай спадчыны, быў пашкоджаны ў выніку выбуху ў Бейруце 4 жніўня. На думку ўлад Лівана, 70 з іх могуць абрынуцца, калі не будуць адноўлены ў самыя кароткія тэрміны, паведамляе Сіньхуа.

«Мы прыкладзём усе намаганні, каб атрымаць сродкі на аднаўленне і захаванне гэтых будынкаў, бо яны прадстаўляюць традыцыйную архітэктуру Бейрута», — заявіў міністр сельскай гаспадаркі і культуры Лівана Абас Муртада. Ён заклікаў рыэлтараў не скупляць гэтыя будынкі для мэт зносу і будаўніцтва новых сучасных аб'ектаў, а таксама звярнуўся да грамадзян, каб тыя захоўвалі гісторыю і культуру горада.

Большасць пабудоў у Гемайзе і Мар-Міхаэлі, якія складаюць старажытную забудову, былі часткова або цалкам разбураныя.

# СПЫНІЦЦА І ЗАДУМАЦЦА

**Праваахоўныя органы вядуць праверку па факце смерці 25-гадовага хлопца з Гомеля і траўміравання пяцігадовай дзяўчынкі з Гродна. Хочацца верыць, што ўсё высветліцца, што вінаватыя будуць пакараныя. Але ўжо сёння вельмі дакладна ясна адно: малады чалавек быў бы жывы, дзіця было б не спалоханае і не з падрапаным тварам, калі б не тое, што адбывалася на вуліцах нашых гарадоў у апошнія дні.**

**Колькі нам яшчэ патрэбна жахаў, каб спыніцца — усім без выключэння? Гэта пытанне задае сабе, напэўна, кожны. Адказаць на яго таксама ўрэшце давядзецца нам усім. Пакуль жа мы з адкрытых крыніц сабралі некалькі меркаванняў людзей — вядомых і не вельмі. Проста ўважліва іх пачытайце.**

*«Я вельмі ганарыўся сваёй краінай, калі мы далі пляцоўку для перамоў Украіне, калі канфліктуючыя бакі селі за стол перагавораў. Тое, што адбываецца ў нас цяпер, — цяжка і балюча для любой краіны. На мой погляд, сёння трэба ўсім спыніцца і пачаць весці дыялог на аснове Канстытуцыі. Таму што самае галоўнае, і гэтаму нас вучыць вопыт суседзяў, — захаванне міру, недапушчэнне чалавечых ахвяр і гвалту. Трэба памятаць, што чалавечае жыццё — найвышэйшая каштоўнасць на зямлі».* (Сяргей КАВАЛЬЧЫК, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага драматычнага тэатра імя Горкага).

*«Мы талерантны і спакойны народ, заўсёды ўмеем выслухоўваць меркаванні іншых. Мы прыязны народ і такім павінныя заставацца заўсёды. Я ўспамінаю страшны час Вялікай Айчыннай вайны, калі гінулі нявінныя людзі, і не дай Бог, каб такое калі-небудзь давялося ўбачыць нашым дзецям і ўнукам! Тады быў ваенны час, і людзі паміралі кожны дзень. Але цяпер спакойны, мірны час. І не трэба яго руйнаваць уласнымі рукамі, дарагія беларусы! Цяпер — час дыялогу і мірных абмеркаванняў. Мы, старэйшае пакаленне, выступаем за тое, каб краіна развівалася, рухалася далей, але ўсё гэта павінна адбывацца мірным шляхам».* (Надзея ЛОСЬ, былая малалетняя вязніца «Азарычы»).

*«Мне б вельмі хацелася, каб гэтая сітуацыя ў найбліжэйшы час нармалізавалася, каб на вуліцах нашых гарадоў аднавіўся парадак, мы вярнуліся да звыклага ладу жыцця, маглі спакойна працаваць. Мы ніколі не супрацьстаялі ўнутры грамадства адно аднаму. Таму, якія б розныя пазіцыі ні былі ў людзей, трэба знайсці адзіны пункт для таго, каб грамадства развівалася далей эвалюцыйным шляхам, а не рэвалюцыйным. Я за мір, за светлую, яркую Беларусь і за брацкія адносіны ўнутры краіны».* (Старшыня беларускага саюза кампазітараў Алена АТРАШКЕВІЧ)

*«Памяркоўнасць, талерантнасць, гуманізм — гэта найлепшыя рысы беларускага нацыянальнага характару, мы спадзяёмся, што розум возьме верх над эмоцыямі, а згода прыйдзе на змену канфрантацыі».* (Са звароту Саюза пісьменнікаў Беларусі).

**Падобныя цытаты можна доўжыць і доўжыць. Але, калі не ўспрымаеце іх, прыслухайцеся да сябе, да свайго сэрца. Гэта ж насамрэч проста — спыніцца і задумацца. Інакш рызыкуем страціць самае дарагое — саміх сябе, сваіх блізкіх, сваю Радзіму.**

## Зварот да чытачоў «Звязды»

**Мы, супрацоўнікі найстарэйшага беларускага выдання — газеты «Звязда», з непакоем і болем глядзім на тое, што гэтымі днямі адбываецца ў краіне. За больш чым сто гадоў існавання «Звязда» ніколі не спыняла сваёй работы і нават у найцяжэйшыя часы несла чытачам веру і надзею. І сёння мы не можам заставацца абыякавымі да таго, што робіцца навокал.**

**Звяздоўцы выказваюць падтрымку ўсім без выключэння, хто пацярпеў у канфліктах апошніх дзён, іх сем'ям і блізкім.**

**Мы заклікаем паважаць журналістаў, якія працуюць на месцы падзей і выконваюць свой прафесійны абавязак. Заклікаем не ўжываць сілу ў дачыненні да тых, хто выказвае сваё меркаванне, і не праяўляць агрэсію — няважна, на якім баку вы знаходзіцеся. Заклікаем усіх паважаць закон, але найперш — чалавечую годнасць. Гвалт можа спарадзіць толькі гвалт.**

**Мы шануем заканадаўства Рэспублікі Беларусь, паводле якога кожны грамадзянін краіны мае права адкрыта выказваць сваю пазіцыю, і лічым, што закладзеныя ў яго правы і свабоды з'яўляюцца неад'емнай часткай гарманічнага і згуртаванага грамадства. Журналісты і супрацоўнікі «Звязды» выступаюць за цывілізаваны шлях вырашэння рознагалоссяў.**

Блізкая ўлада

# Мясцовая вертыкаль на сувязі

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 15 жніўня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- кіраўнік спраў Гродзенскага аблвыканкама Ігар Андрэевіч ПАПОЎ. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Добрая навіна

# ВАДА БУДЗЕ ЧЫСТАЙ

**У аграгарадку Бродніца Іванаўскага раёна рыхтуецца да ўводу ў эксплуатацыю станцыя абезжалезвання вады, паведаміў карэспандэнту БелТА начальнік аддзела вадаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі абласнога ўпраўлення ЖКГ Андрэй КРУГЛЕЙ.**

— Будаўніча-мантажныя работы ўжо завершаны. Цяпер ідзе пусканаладка тэхналагічнага абсталявання, паралельна афармляюцца акты ўводу аб'екта ў эксплуатацыю, — сказаў Андрэй Круглей. Станцыя будзе працаваць у аўтаматычным рэжыме. Яе магутнасці дазваляюць за гадзіну чысціць да дзесяці кубаметраў вады.

Для населенага пункта, у якім пражываюць амаль паўтысячы жыхароў, гэта доўгачаканы аб'ект. Раней утрыманне жалеза ў пітной вадзе тут перавышала нормы ў некалькі разоў, пра што сведчаць вынікі лабараторных даследаванняў. З уводам аб'екта ў эксплуатацыю гэтая праблема вырашыцца, і жыхары Бродніцы будуць забяспечаны вадой нарматыўнай якасці. Падобная станцыя абезжалезвання неўзабаве будзе таксама запушчана ў аграгарадку Дастоева Іванаўскага раёна.

Усяго ў рэгіёне сёлета плануецца пабудаваць 41 станцыю абезжалезвання. Пераважная большасць аб'ектаў запланавана падпраграмай «Чыстая вада» дзяржаўнай праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2016–2020 гады.

Адна станцыя ў Лунінецкім раёне будуецца па праграме пераадолення наступстваў катастрофы на ЧАЭС. На гэтыя мэты выдзелена Br6,1 млн з абласнога бюджэту і Br3,6 млн — з рэспубліканскага. Ужо ўведзены ў эксплуатацыю 19 аб'ектаў, на 18, вядуцца работы.

Яшчэ чатыры станцыі (дзве — у Брэсцкім, па адной — у Івацэвіцкім і Кобрынскім раёнах) пачнуць будаваць у жніўні. Да канца года якаснай вадой павінны быць забяспечаны 95,3 % спажыўцоў Брэсцкай вобласці.

# ЯКІЯ КНІГІ КУПЛЯЮЦЬ БЕЛАРУСЫ?

**Сярод выдавецтваў дзяржаўнай формы ўласнасці ў рэйтынгу продажаў ААТ «Белкніга» кніг на беларускай мове за студзень — ліпень 2020 года лідарам з'яўляецца выдавецтва «Мастацкая літаратура».**

Так, яе кнігі не ў першай пяцёрцы, але затое ў рэйтынг са 100 назваў трапілі 26 выданняў «Мастацкай», што сведчыць пра стабільнасць, разумную стратэгію ў выбары таго, што варта прапаноўваць айчыннаму чытачу. На 13-й пазіцыі — «Дзіцячы атлас Беларусі. Славутыя імёны». У яго сёлета знайшліся 82 пакупнікі. Праз некалькі «прыступак» — на 16-м месцы — «Дзіцячы атлас Беларусі. Птушкі» (прададзена 78 асобнікаў). На наступным месцы — раман Андрэя Федарэнкі «Жэтон на метро». Прададзена 77 экземпляраў. На 22-й пазіцыі — зборнік аповесцяў Васіля Быкава, куды ўвайшлі «Знак бяды», «Абеліск», «Жураўліны крык». Прададзена 65 экземпляраў. З кніг «Мастацкай літаратуры» ў рэйтынгу — і калектыўны зборнік апавяданняў, казак, вершаў «Беларускае лета», кніга Віктара Гардзея «Сарочына цырульня», «Эла і сябры» Ціма Парвела.

А што да першай пяцёркі, то ў яе ўвайшлі наступныя выданні. На першым месцы — «Гары Потэр і філасофскі камень» Д. Роўлінг (266 экземпляраў прададзена больш чым у 100 дзяржаўных кнігарнях). На другім — раман Віктара Марціновіча «Мова» (185 экземпляраў; выдавецтва «Кнігазбор»). Трэцюю пазіцыю займае «Маленькі прынц» Антуана дэ Сент-Экзюперы (прададзена 167 экземпляраў; «Попурри»). На чацвёртым і пятым месцах — кнігі Уладзіміра Караткевіча: прададзена 143 экземпляры «Дзікага палявання караля Стаха» і 141 экземпляр «Каласоў пад сярпом тваім» (выдавец і першай, і другой — «Попурри»).

Несумненна, рэйтынгі продажаў ААТ «Белкніга» адлюстроўваюць не ўсю палітру кніжных зацікаўленняў тых жыхароў краіны, хто чытае па-беларуску. І тым не менш нельга не ўлічваць тэндэнцыі, якія складваюцца менавіта ў гэтай найбуйнейшай кнігагандлёвай сетцы краіны: «Белкніга» аб'ядноўвае 101 гандлёвы аб'ект.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Надвор'е

# Цяпло вернецца на выхадных

**Антыцыклон «Эміль» падарыў нам тыдзень халаднаватага і сухога надвор'я. Але верасьнёўскія ноткі ў надвор'і пакуль возьмуць тайм-аўт — да нас спяшаецца летні рэнесанс. Падрабязней пра сінаптычную абстаноўку ў будучыя выхадныя расказалі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Удзень у пятніцу будзе яшчэ не вельмі цёпла — ад 18 да 24 градусаў цяпла. Праўда, на паўднёвы захад ужо пачне распаўсюджвацца цяплейшае паветра — там чакаецца ад 25 да 27 са знакам «плюс». Вецер будзе слабы, пераменных напрамкаў. Ападкаў не прагназуецца.

А вось субота адзначыцца вяртаннем летняга надвор'я. Праўда, цёпла будзе толькі ў дзённы час сутак — ад 20 да 29 цяпла. Уначы ж — усяго ад 7 да 14 градусаў, да таго ж месцамі каля вадаёмаў чакаецца слабы туман. Ападкаў не будзе — ад іх надзейна абароніць вобласць павышанага атмасфернага ціску. За адным выключэннем — праз Віцебскую вобласць усё-такі пройдзе не вельмі актыўны атмасферны фронт, таму там магчымы невялікія дажджыкі.



Па-сапраўднаму цёплай чакаецца нядзеля. Вецер трывала зменіцца на заходні, і да нас пойдзе прагрэтае паветра з Заходняй Еўропы. Па-ранейшаму ўначы сям-там будуць утварацца туманы. Удзень чакаецца сапраўды шыкоўная тэмпература — ад 23 да 29 цяпла. Праўда, уначы істотна не пацяплее — сіноптыкі абяцаюць усяго ад 9 да 16 градусаў.

Па папярэдніх прагнозах, такі ж цёплы чакаецца і панядзелак.

І ўсё б нічога, але ў многіх раёнах даўно не было ападкаў. Праз гэта ў рэгіёнах краіны працягвае ўзрастаць пажарная небяспека. Ужо ўведзены забароны і абмежаванні на наведванне лясоў у 45 рэгіёнах краіны. У разрэзе па абласцях безумоўна лідзіруе Гомельшчына — у «чырвонай зоне» ўсе раёны, акрамя Ельскага. А вось у Віцебскай вобласці падобных забарон няма.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ДРУГАЯ РАБОТА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***Ніна Міхайлаўна, 71 год, пенсіянерка, гандлюе каля станцыі метро «Каменная горка», Мінск:***

— Чарніцы прадаю па пяць рублёў за літр, памідоры — таксама пяць рублёў за кілаграм, агуркі — па тры рублі, кабачкі — колькі дасце. Усё гэта сваё, з агарода. Я ў прыватным сектары жыву, тут недалёка. Хапае на закаткі, і трохі застаецца на продаж. А чарніцы — гэта я ў лес ездзіла ўчора. Думаю, рублёў на 15 сёння нагандлюю. Пенсія ў мяне невялікая, а гэта — усё ж нейкая капейчына.

## ГРУБАЯ ФІЗІЧНАЯ СІЛА

«Вольныя рукі» патрабуюцца і на будоўлі, і ў вытворчасці. Для таго каб грузіць або прыбіраць смецце, кваліфікацыя не патрэбная. Сустрэць у гэтай сферы можна самых розных людзей — ад 19 да 60, з вышэйшай, сярэдняй адукацыяй або практычна без адукацыі. У дзень можна зарабіць да 50 рублёў. Начная работа ацэньваецца ў большую суму, але знайсці разавую начную работу складана, хоць прапановы часам з'яўляюцца ў групах у сацсетках. Часцей на такія падпрацоўкі запрашаюць удзень, і адразу некалькі чалавек. Ва ўмовах пішуць, што патрэбна рабіць (грузіць, капаць і г. д.), колькі патрэбна рабочых, на які час, якая будзе аплата.

***Андрэй, 40 гадоў, трэнер:***

— Улетку ў трэнераў значна скарачаецца заробак — амаль усе на канікулах, вяртаецца ў залы і секцыі асноўная частка людзей бліжэй да канца верасня. У мяне сям'я, і на лета я ў апошнія гады ўладкоўваюся працаваць грузчыкам. Работа, зразумела, фізічна цяжкая, ды і з аплатай бываюць праблемы. Паколькі працуеш часам нават без дагавора, па вуснай дамоўленасці з работадаўцам, то загадзя нікол не можаш быць упэўнены, што табе заплацяць столькі, колькі абяцалі. Ну і, зразумела, умовы работы звычайна маглі б быць лепшыя. Гэта датычыцца і тэхнікі бяспекі, і ўмоў для прымання ежы падчас абедзеннага перапынку. Суцяшае тое, што «бяры больш — кідай далей» — традыцыйны спосаб падпрацоўкі многіх дастойных людзей мінулага. Рок-музыкі, пісьменнікі (напрыклад, Цой, Даўлатаў) праз гэта праходзілі. Як і ў савецкім мінулым, сёння сярод калег-грузчыкаў часам можна сустрэць цікавых людзей з унікальным жыццёвым вопытам.

## ФАСОЎКА І ЎПАКОЎКА

Фасоўшчыкі і ўпакоўшчыкі пастаянна патрабуюцца ў такія буйныя кампаніі, як, напрыклад, «Еўраопт» або Wildberries. Можна знайсці як дзённую, так і начную работу. Звычайна працаваць даводзіцца па 12 гадзін некалькі дзён запар, потым — некалькі дзён адпачынку. Рыхтуйцеся да вылікаў за памылкі ў зборы заказу і ўвогуле за любы промах — такія вылікі могуць «з'есці» каля паловы аплаты, якую вам абяцалі. На перакуры, каву, размовы па тэлефоне і ўвогуле на адпачынак падчас рабочага дня (або ночы) давядзецца забыцца. Умовы работы на складзе часта не найлепшыя. З плюсаў — магчымасць сумяшчаць дзве работы, калі здароўе дазваляе, скончыўшы працоўны дзень, адразу адпраўляцца на працоўную ноч.

***Міхаіл, 45 гадоў, пісьменнік:***

— Я працаваў у буйной кампаніі «Еўраопт» камплектоўшчыкам. Менавіта начная работа мне і падыходзіла. Графік — 2-2-3, гэта значыць дзве ночы па 12 гадзін і два дні адпачынку, потым — зноў дзве ночы па 12 гадзін і столькі ж вольных, потым тры працоўныя ночы і трое сутак адпачынку. З плюсоў — поўны сацпакет. І гэта, уласна, кажучы, усе плюсы. Зарплата, якую традыцыйна абяцаюць для тых, хто працуе ўначы, больш, чым у дзённых работнікаў, на практыцы аказваецца больш на капейкі. Як бы вы ні планавалі свае вольныя дні, на трэцюю ноч запар работнік з вас будзе сонны і стомлены. Хочаце вы таго ці не хочаце, але вы будзеце памыляцца. І ў выніку аднойчы ў мяне атрымалася, што я адпрацаваў начную змену ў мінус 150 рублёў. Работа гэтая падыходзіць для маладых людзей, і зусім не для студэнтаў дзённай формы навучання, як можна было б падумаць напачатку.



## ПРЫБОРКА

Падпрацоўка прыбіральшчыцай — часцей за ўсё выбар жанчын пенсійнага ўзросту. Але апошнім часам нярэдка ў якасці другой работы яе абіраюць і дастаткова маладыя жанчыны. Гэта можа быць прыборка вытворчых або падсобных памяшканняў прадпрыемстваў, крам (прыбіральшчыцы гандлёвых залаў — гэта звычайна поўны рабочы дзень), офісаў.

***Валянціна Пятроўна, пенсіянерка, 62 гады, працуе карэктарам у часопісе:***

— У мяне ёсць асноўная работа, на яе я прыходжу ў 12 гадзін. А раніцай прыбіраю ў банку. Я, шчыра кажучы, вельмі задаволеная — памяшканні чыстыя, прыходжу на другую працу ў 7-8 гадзін раніцы і ў 10-11 ужо вольная. І 300 рублёў зарплаты зусім не лішнія. Стамляюся, канешне, затое ёсць магчымасць дапамагаць дочкам і ўнукам. Зразумела, прыбіраць на складзе або ў краме было б значна цяжэй.

***Зоя Нікіфараўна, 50 гадоў, прадавец:***

— Мая другая работа — прыборка памяшканняў і мыццё посуду ў рэстаране. Мяне выклікаюць, калі ў рэстаране праходзяць буйныя мерапрыемствы: банкеты, вяселлі і г. д. Тое, што могуць патэлефанаваць і выклікаць на другую работу сёння на заўтра, — гэта, зразумела, мінус. Даводзіцца мяняцца з калегамі зменамі на асноўнай рабоце, ды і вольных дзён практычна не бывае. У астатнім я бачу ў гэтай рабоце толькі плюсы. Заробак — у сярэднім 300 рублёў у месяц, бывае і больш. Праўда, падчас пандэміі мерапрыемствы праводзіліся рэдка, і мой заробак скараціўся.

## ПАДПРАЦОЎКА ЗА КАМП'ЮТАРАМ

Аддаленая работа за камп'ютарам падыходзіць многім — дызайнерам, рэдактарам, журналістам, людзям іншых прафесій, якія могуць добра пісаць тэксты або ствараць дызайн. З плюсоў — магчымасць рабіць заданні ў любы зручны час (калі не патрэбны зносіны з кліентамі ў рэжыме рэальнага часу). Запатрабаваны як капірайтынг, так і стварэнне ўнікальных тэкстаў, дызайну і ролікаў для сацыяльных сетак (часцей за ўсё — для Instagram), напісанне каментарыяў і адказы на іх. З мінусаў — тое, што на гэтым рынку прапанова большая за попыт, а таксама жорсткі дэдлайн па выкананні работ. Такая работа патрабуе ўседлівасці, самадысцыпліны і неканфліктнасці (работадаўца можа бясконца патрабаваць уносіць праўкі і перапрацоўваць дызайн). Акрамя таго, каб зарабіць больш-менш значную суму, трэба працаваць не пакладаючы рук. Звычайныя расцэнкі на тэксты (капірайт) — каля долара — двух за 1000 знакаў. Калі вы можаце ствараць камп'ютарны дызайн або прасоўваць рэсурсы, вам заплацяць больш. У сярэднім можна зарабляць каля 400—600 рублёў у месяц.



***Ганна, 35 гадоў, журналіст:***

— Я працавала на адным з рэсурсаў, дзе пачынаючыя аўтары выкладваюць свае літаратурныя творы, якія чытачы пампуюць за невялікія грошы. Маёй задачай было рэдагаванне стылю і карэктура гэтых твораў. У асноўным мела справу з жаночымі раманамі. За раман прыкладна ў 250—300 тысяч камп'ютарных знакаў я атрымлівала каля 80—100 рублёў. Літаратурная якасць твораў была не надта высокая, каб не сказаць больш. Было зашмат граматычных і пунктуацыйных памылак, і вельмі часта даводзілася па некалькі разоў чытаць адзін абзац, каб зразумець, што ж хацеў данесці да чытача аўтар. Таму на адзін раман патрабавалася каля пяці—шасці вечароў. Работа гэта карпатлівая, яна патрабуе пастаяннай увагі. Ад яе хутка стамляешся.

***Вольга, 34 гады, графічны дызайнер:***

— Я займаюся стварэннем сайтаў і камп'ютарным дызайнам. Працую ў асноўным на Расію і Прыбалтыку, часам на Еўропу — па грашах гэта лепш. З мінусаў такой работы — можа быць перагрузка, а можа быць поўны штыль, калі ніводнага запыту няма. Калі бярэш работу на выхадныя, то гэта ноч пятніцы, субота, нядзеля і ноч на панядзелак. Затое зарабляеш, здараецца, нават больш, чым на асноўнай рабоце. Калі ўсё добра з заказамі, можна зарабіць 800 рублёў у месяц і нават значна больш. Але гэта спецыфічны лад жыцця. Трэба ўмець адпачываць — хоць бы адзін раз на два тыдні павінны быць паўнавартасныя выхадныя.

## ТЭЛЕФОННЫЯ РАЗМОВЫ

Гэты від падпрацоўкі падыходзіць тым, хто ўвесь час знаходзіцца дома, — напрыклад, матулям у адпачынку па выхаванні дзіцяці. Пастаянна патрабуюцца дыспетчары, кансультанты інтэрнэт-магазінаў, спецыялісты па продажы, якія могуць працаваць аддалена на «халодных званках». Як правіла, абяцаюць за такую работу нядрэнныя грошы (каля 700 рублёў), але па факце ў пачатку кар'еры плаціць будуць значна менш, таму што зарплата наўпрост залежыць ад выніку работы.

***Аліна, 28 гадоў, рэдактар «глянцу»:***

— Я займалася продажам на «аддалёнцы». Прапанавала па тэлефоне і ў інтэрнэце афлайн-івэнты, паслугі па стварэнні і напаўненні сайтаў, дызайне інстаграм-акаўнтаў, напісанні рэкламных тэкстаў. Адразу хачу сказаць: пакуль не напрацуеш уласную кліенцкую базу, «халодныя званкі» моцна вымотваюць і псуюць настрой, а заробак нізкі. Але паступова ў гэтай сферы можна набыць вопыт і павялічыць заробак. Я працавала на акладзе (ён быў мізэрны) плюс працэнт ад здзелкі. Праблема ў тым, што часам на такой рабоце ты зусім не абаронены. Напрыклад, за апошнія здзелкі мой працэнт мне так і не заплацілі. Растлумачылі гэта тым, што з-за каранавіруса кампанія страціла грошы і можа выплаціць толькі аклад.

## HAND-MADE

Калі ў вас рукі растуць адкуль трэба, вы можаце зарабляць на хэндмэйдзе. У якасці асноўнай работы гэта не найлепшае рашэнне, але як дадатковы заробак — добры варыянт. Цацкі, вязаныя рэчы, скураныя вырабы і ўпрыгажэнні ручной работы выклікаюць цікавасць, а знайсці пакупніка ў эпоху інтэрнэту стала значна прасцей — існуюць парталы, дзе хэндмэйдмайстры прадаюць свае творы.

***Таццяна, 33 гады, бухгалтар:***

— У вольны час я ствараю дызайнерскую біжутэрыю. Колькі можна зарабіць на хэндмэйдзе — складанае пытанне. Ва ўсіх па-рознаму, у залежнасці ад таго, што ты робіш і як ты гэта робіш. Па заробку можа быць нуль рублёў у месяц, а можа быць і нядрэнна — можна зарабіць сабе другую зарплату, 600-800 рублёў. І плюс, і мінус гэтай работы — тое, што ты нібыта не абмежаваны ў сваіх магчымасцях, але тое, будзеш ты з грашыма або застанешся без заробку, шмат у чым залежыць ад выпадку і ўдачы. Важна памятаць: каб ствараць і прадаваць хэндмэйд, трэба аформіць у падатковай інспекцыі па месцы рэгістрацыі «рамесную дзейнасць». На мой погляд, стварэнне хэндмэйду — нядрэнны спосаб падпрацоўкі, але толькі для людзей пэўнага складу.

## ТУРЫЗМ І ІВЭНТЫ

Многія турфірмы і івэнт-агенцтвы шукаюць людзей, гатовых абслугоўваць карпаратывы на прыродзе, сплаўляць турыстаў на байдарках і арганізоўваць іх вольны час падчас выездаў за горад. Калі вы заядлы «паходнік», умееце развесці вогнішча, паставіць палатку і ведаеце, як карыстацца вяслом, гэта — ваш варыянт.

***Арына, 32 гады, спецыяліст па продажы:***

— Мы з мужам кожнае лета па выхадных днях працуем на карпаратывах. Група прыбывае да месца збору, згружае свае рукзакі ў маю машыну і сплаўляецца па рацэ пад кіраўніцтвам інструктара (майго мужа) да месца начлегу. Тым часам я стаўлю палаткі, гатую ежу — суп, шашлык, салацікі — і сустракаю гасцей. Работа цікавая і пазітыўная. Але моцна стамляешся, бо ўсё лета працуеш увогуле без выхадных. Падчас такіх выязных карпаратываў прачынацца нам даводзіцца ў пяць гадзін раніцы, каб усё паспець, а спаць мы кладзёмся, калі лягуць апошнія госці. Трэба мець экіпіроўку, закупіць прадукты па спісе на тыдні, пасля асноўнай работы, забяспечыць людзям камфорт. Бо пераважная большасць з іх — гарадскія жыхары, ім складана адаптавацца да паходных умоў. Затое кожнаму можна зарабіць у эквіваленце каля 100 долараў за выхадныя. Мінусы такой работы — сезоннасць і тое, што яна вельмі залежыць ад надвор'я.

## ШУКАЦЬ І НЕ ЗДАВАЦЦА

Знайсці падпрацоўку складана. Даводзіцца суадносіць яе з графікам асноўнай работы і правільна разлічваць уласныя сілы. Ды і прапаноў работ з гібкім графікам на рынку працы не надта многа. Дзе ж яе шукаць? На сайтах па пошуку работы, у групах сацыяльных сетак, па сваяках-сябрах-знаёмых. Калі не ведаеце, што канкрэтна вы шукаеце ў якасці падпрацоўкі, паспрабуйце розныя варыянты. Іх многа — значна больш, чым пералічана ў гэтым артыкуле. Прыгадайце свае дзіцячыя або юнацкія хобі — можа быць, яны падкажуць, якое з вашых уменняў можна манетызаваць.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Добрыя справы

# МАЙСТАР НА ЎСЕ РУКІ

**Калі нехта думае, што сацыяльным абслугоўваннем пенсіянераў і інвалідаў займаюцца выключна жанчыны, ён глыбока памыляецца. Аляксандр ПАСЯЛЕНЦАЎ прысвяціў гэтай справе 13 гадоў свайго жыцця.**

Да гэтага ён працаваў кіроўцам у райспажыўкаапераціі, але пасля чарговай аптымізацыі застаўся без работы. Доўга склаўшы рукі не сядзеў. Неяк яго папрасілі падрамантаваць дом, і мужчына справіўся на выдатна. З гэтага, па сутнасці, усё і пачалося. Слаўгарадскаму раённаму Цэнтру сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва такія людзі вельмі патрэбныя — цвік прыбіць, траву абкасіць, зямлю культываваць.

Аляксандр — майстар на ўсе рукі, смяецца, што жыццё ў вёсцы ўсяму навучыць. У дзяцінстве трэба было дапамагаць маці з бацькам. У сям'і гадавалася трое дзяцей, і ў кожнага былі свае абавязкі. Гаспадарка мелася не маленькая — карова, авечкі, куры... А калі бацька працаваў з малатком ці пілой, то заўсёды браў сына ў памочнікі. Цяпер гэтыя атрыманыя ў маленстве веды спатрэбіліся.

У цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Аляксандр Пасяленцаў — асоба папулярная. Тыя, хто маюць патрэбу ў цяжкай мужчынскай рабоце, заўсёды разлічваюць на яго. За ліпень Аляксандр аказаў 60 відаў паслуг, а гэта не такая ўжо і маленькая лічба, улічваючы, што працуе ён не толькі ў маштабах Слаўгарада, але і ўсяго раёна. Аб'ёмы работ таксама розныя. Дзесьці трэба агародчык прывесці да ладу, а дзесьці выкасіць 10, а тое і 20 сотак. Бывае, што і абедаць прыходзіцца на хаду.

Хутка пачнецца сезон збору ўраджаю, а значыць, павялічыцца колькасць заказаў на культываванне. Хоць іх і зараз хапае. Больш паслугамі карыстаюцца паважанага ўзросту жанчыны, але і для некаторых адзінокіх сталых мужчын градкі — сэнс жыцця.






Тыя, каго Аляксандру прыходзіцца абслугоўваць, большай часткай бездапаможныя і адзінокія, нават з існуючымі роднымі і дзецьмі. Ім за шчасце з чалавекам пагутарыць. Пакуль робіць справу, Аляксандр можна стольк розных гісторый пачуць, што, здаецца, на аповесць хапіла б: некаторыя бабулькі любяць расказваць пра сваё жыццё ледзь не з маленства. І сацработнік іх не перабівае, бо разумее, што людзям трэба выказацца, ад гэтага ім становіцца лягчэй. Ёсць такія вёскі, дзе жыве наогул два-тры чалавекі, і адлегласць паміж іх дамамі амаль паўкіламетра. Старым нагам яе ўжо не пераадолець.

На рабоце Аляксандр з 8 гадзін раніцы, але да канца рабочага дня — 17.00 — не заўсёды паспявае ўсё зрабіць. З раёна і наогул гадзін у восем вечара можна вярнуцца. Хоць кіраўніцтва гэта не вітае, бо ведае, як цяжка прыходзіцца працаваць.

Шмат заказаў паступае на дастаўку прадуктаў. І тут Аляксандр заўсёды гатовы падставіць сваё моцнае плячо. Кажа, што ў гэтай справе павінны быць строгі парадак і празрыстасць. Прыйшоў да кліента, узяў спіс з прадуктамі, грошы, распіску абавязкова, а лепш нават дзве, яшчэ і для заказчыка, каб потым прэтэнзій не было, што здача малая. Здараліся выпадкі. Цяпер нават пасля таго, як усё дастаўлена, Аляксандр бярэ яшчэ распіску, што прэтэнзій кліент не мае.

У такой спецыфічнай рабоце, як сацабслугоўванне, галоўнае — дагадзіць кліенту, не давесці справу да канфлікту. Старыя людзі бываюць вельмі бурклівыя. Аляксандр гэта разумее і лічыць правільным дзесьці змаўчаць, не злавацца на хворага чалавека. За гэта народ яго паважае, тэлефануе, каб кіраўніцтва адзначыла. Называюць яго «наш любімчык».

Руплівага работніка неаднаразова ўшаноўвалі, а нядаўна ён атрымаў міністэрскую ўзнагароду.

**Людміла ВАРАНЦОВА, дырэктар Слаўгарадскага раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дэпутат Слаўгарадскага райсавета, валанцёр грамадскай арганізацыі «Чырвоны крыж»:**

*— У нашай рабоце няма абыякавых людзей, усе 43 супрацоўнікі Цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва адказныя і сумленныя работнікі. У нас на абслугоўванні 405 адзінокіх і адзінока пражываючых грамадзян, да кожнага трэба знайсці падыход і аказаць усю неабходную дапамогу. І нашы работнікі добра спраўляюцца з гэтай місіяй, за гэта я ўсімі імі ганаруся. Сярэдні ўзрост працуючых — 35—40 гадоў, але ёсць і зусім маладыя. Той жа Вікторы Гарнастаевай, напрыклад, усяго 25 гадоў. Яна, дарэчы, яшчэ і шматдзетная мама — такіх, наогул, у калектыве працуе чатыры.*

Калі ў Магілёве адзначалі сацработнікаў за плённую працу ва ўмовах каранавіруса, сярод іх быў і Аляксандр Пасяленцаў. Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч асабіста ўручыла яму міністэрскую Падзяку. Аляксандр вельмі ўдзячны за такую адзнаку. І кажа, што галоўнае для яго — людская павага, бо прывык рабіць усё сумленна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

Шануй сваё

# ДАКРАНУЦЦА ДА МІНУЛАГА

## Як выглядалі беларускія рыцары



**Цяжкія даспехі, бліскучыя шаблі і баявыя сякеры, хітра сплеценая кальчуга, шчыты з гербамі — створаныя ў наш час, але максімальна блізкія да старажытных арыгіналаў, што выкарыстоўвалі нашы продкі ў XIV—XVII стагоддзях. Звычайна ўбачыць іх можна хіба на летніх ваенна-гістарычных фестывалях (якія, праўда, сёлета збольшага былі адменены з-за пандэміі каранавіруса), а вось магчымасць падрабязна разглядзець і паслухаць захапляльныя навукова-папулярныя расказы даследчыкаў і майстроў — кавалёў, металургаў, рэканструктараў, — напэўна, з'явілася ўпершыню. Тут дарослыя наведвальнікі могуць нават прымераць на сябе шлем і шчыт, а маленькія — расфарбаваць тэматычныя «рыцарскія» размалёўкі. Выстаўка «Гістарычная рэканструкцыя. Дакраніся да мінулага» адкрылася ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі і працягне сваю работу да 6 верасня.**



Экспазіцыя — своеасаблівы бэкстэйдж рэканструкцыі, яе ўнутраны бок, які спалучае тэорыю і практыку, мастацкую творчасць і навуку. «Наш праект, які вырас з папярэдняга — фотавыстаўкі «Грунвальд. Сёння», не столькі пра зброю і рыцарскія даспехі, колькі пра любоў да гісторыі і яе ўвасабленне, — адзначае **старшы навуковы супрацоўнік музея Алена БУХАЛ**. — Беларускія рэканструктары, асабліва конныя, з такой дакладнасцю, адказнасцю і руплівасцю падыходзяць да ўзнаўлення гісторыі, што ўваходзяць у топ-10, калі не ў топ-5 найлепшых у Еўропе. Наогул рэканструктарская справа блізкая да музейнай у тым сэнсе, што яна набліжае акадэмічную навуку да папулярнай сферы, і гэта трэба рабіць вельмі акуратна, вывучаючы крыніцы і правяраючы факты». Усе прадстаўленыя даспехі створаныя па канкрэтных гістарычных узорах і здольныя



выконваць сваю задачу — абараняць уладальніка. Наведвальнікі могуць прасачыць развіццё еўрапейскай ваеннай справы на працягу некалькіх стагоддзяў і ў адным баку выстаўкі ўбачыць, як выглядалі рыцары ВКЛ пры бітве пад Грунвальдам, колькі жалеза насілі на сабе воіны Анастасіі Слуцкай і крылатыя гусары Стэфана Баторыя, а ў другім — трапіць у стылізаваную кавальскую слабаду і паглядзець, у якіх умовах у раннім, высокім і познім Сярэднявечны працавалі тыя, хто гэтыя даспехі вырабляў, — кавалі і збройнікі.

**Майстар Дзмітрый АНДРЭЕЎ** захапляецца кавальскай справай з 16 гадоў, неаднаразова ўдзельнічаў у пленэрах па мастацкай коўцы, фэстах сярэднявечнай культуры і міжнародных святах прафесійнага кавальскага майстэрства, а таксама ў навуковых канферэнцыях даследчыкаў старажытнага ўзбраення і фартыфікацый. Сёння ён — магістрант БНТУ, металург і вядомы ў рэканструктарскіх колах каваль. Частка даспехаў-экспанатаў, расказвае ён, была выраблена якраз пры дапамозе інструментаў, таксама прадстаўленых на выстаўцы. «Я рады, што ўдалося сабраць у адным месцы гісторыкаў, навукоўцаў, рэканструктараў, майстроў, дзеячаў культуры і мастацтва і ў цэлым нераўнадушных да нашай гісторыі людзей, і вельмі хацелася б, каб гэтая пляцоўка стала месцам для навукова-дыскусійнага дыялогу паміж тэарэтыкамі і практыкамі, каб усё можна было кранаць рукамі, паспрачацца і знайсці адказы на пытанні, якія цікавяць многіх даследчыкаў. Спадзяюся, што цяперашняя выстаўка стане толькі пачаткам у шэрагу падобных праектаў — нам ёсць што сказаць і паказаць, раскрыць тэму рэканструкцыі ў больш шырокіх храналагічных межах, паглыбіцца ў дэталі, — кажа майстар. — Усё астатняе, мяркую, за мяне скажуць мае работы: за кожнай з іх без перабольшання стаяць гады працы і пошуку пытанняў на адказы».

...Беларускія рэканструктары пачыналі сваю справу яшчэ ў 90-я гады мінулага стагоддзя, калі была дасяжная малая колькасць навуковых крыніц і многія рэчы даводзілася ўзнаўляць літаральна па карцінках, прыкладных мерках і ўласных разліках, згадвае **стваральнік гістарычных клубаў «Полацкі звяз» і «Жалезны воўк» (Наваполацк), «Калюмны» (Мінск), акцёр, трэнер па гістарычным фехтаванні Юрый УСЦІНОВІЧ**. Юрый называе сябе хутчэй не практыкам, а папулярызатарам гістарычнай рэканструкцыі: «Мне заўжды было вельмі балюча за тое, што тыя калекцыі, якія захоўваліся ў беларускіх замках і палацах — зброя, арсенал, — фактычна ўсе павывозіліся за межы краіны, і ў нас практычна нічога не засталося. Вярнуць іх цяпер мы, на жаль, не можам. Але рэканструктарскі рух сёння дайшоў да такой ступені, што сучасныя майстры могуць ствараць сапраўдныя шэдэўры па старых узорах і новыя калекцыі, якія будуць спрыяць асветніцкай рабоце, паказваць нашу спадчыну, гісторыю і культуру, — што мы не толькі сялянская нацыя, але і нашчадкі высакароднай шляхты, мужных ваяроў, умелых майстроў».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

## Туринский сельский исполнительный комитет Пуховичского района Минской области 31 августа 2020 года в 15.00 в здании Туринского сельского исполнительного комитета, расположенного по адресу: аг. Турин, ул. Центральная, д. 49 Б Пуховичского района Минской области проводит повторно открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Адрес земельного участка | Площадь земельного участка *(га)* | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации *(рублей)* | Начальная цена *(рублей)* | Задаток *(рублей)* |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 д. Баськи, 47А, 624487900601000098 | 0,1500 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 1375,19 + объявление | 2808,00 | 280,80 |
Таццяна Міхайлаўна з вёскі Апаліны Слуцкага раёна адзінокая, інвалід ІІІ групы. Ёй вельмі патрэбны танометр для вымярэння крывянога ціску, але за сваю невялікую пенсію набыць яго праблематычна. Яна прасіла купіць ёй апарат.

Наталля Якубіцкая паабяцала паспрабаваць знайсці для гэтага спонсара.

Марына Уладзіміраўна з Цімкавіч Валожынскага раёна хадайнічала за Віктара Фёдаравіча, якога даглядае. Яму 83 гады, інвалід, перанёс тры інсульты. А нядаўна яму зрабілі аперацыю і паставілі прыстасаванне для адводу вадкасці, якое трэба рэгулярна мяняць. Па выкліку ўрачы хуткай дапамогі правялі неабходную працэдуру. Але медыкі сказалі, што ў далейшым прыязджаць не будуць.

Наталля Якубіцкая супакоіла жанчыну, што звернецца ва ўпраўленне аховы здароўя Мінаблвыканкама, каб мужчыну аказвалі дапамогу на пастаяннай аснове.

Усяго ж старшыня абласнога Савета дэпутатаў выслухала каля трыццаці чалавек. Частка заяўнікаў атрымала кансультацыю, некаторыя пытанні вырашыліся адразу. А на тыя звароты, што патрабуюць выезду на месца або больш падрабязнага вывучэння, заяўнікі атрымаюць адказы ў азначаныя заканадаўствам тэрміны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМЕНА

# СКАРЫ СВАЮ ВЯРШЫНЮ

## Асіповіцкая школа № 3 будзе натхняць сваіх вучняў на вучобу з дапамогай арт-мастацтва

**Сімвалічны малюнак вышынёй на ўсе тры школьныя паверхі з'явіўся тут зусім нядаўна. Дзяўчынка з заплечнікам шпарка бяжыць па лясной сцяжынцы ўверх — насустрач высачэзным гарам, якія ўзвышаюцца на гарызонце. А знізу подпіс «Скары сваю вяршыню». Якая вяршыня можа быць у вучня? Ну, канешне, выдатная вучоба!**



Тэму для мурала выдумляць доўга не прыйшлося. Экалогія! Асіповіцкая школа № 3 актыўна займаецца праектнай дзейнасцю ў гэтым кірунку і рэгулярна атрымлівае міжнародныя гранты. Апошні адукацыйны праект, у якім яна задзейнічана, — «Зялёныя школы». На базе ўстановы сёння працуе клуб экалагічнага маніторынгу Магілёўскай вобласці, які аб'ядноўвае ўсіх ахвотных зрабіць наша асяроддзе чысцейшым, — грамадзян, прадпрыемствы, арганізацыі вобласці. На рахунку вучняў — 30 прэзідэнцкіх прэмій за перамогі на рэспубліканскім узроўні па хіміі і біялогіі.

Аформіць школу ў духе сучаснага арт-мастацтва вырашылі пасля таго, як наведалі нацыянальны адукацыйна-аздараўленчы дзіцячы цэнтр «Зубраня». І вучні, і настаўнікі прыйшлі ў захапленне ад убачаных там малюнкаў на фасадах. Высветлілася, што іх аўтары — студэнты БНТУ.

— Калі мы пра гэта даведаліся, адразу ж звярнуліся да кіраўніцтва ўніверсітэта з просьбай зрабіць і нам такую прыгажосць, — кажа **настаўніца хіміі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Святлана ЗАЙЦАВА.** — Мы ж пастаянныя ўдзельнікі іх конкурсу «Тэхнаінтэлект». Нас выслухалі і пайшлі насустрач. Прыехалі дзяўчаты з архітэктурнага факультэта і на працягу тыдня размалёўвалі тарэц школы. Мы ж, у сваю чаргу, забяспечылі іх усім неабходным матэрыялам.

Эскіз малюнка распрацавала студэнтка трэцяга курса Марыя Анкудовіч, а ўвасобіць яго ў жыццё ёй дапамаглі аднакурсніцы Валерыя Васілевіч, Дар'я Карэцкая, Валерыя Папова і Ганна Цітавец.

Кіравала працэсам натхняльнік і вопытная ў такіх справах студэнтка пятага курса Ганна Зянько. Работа была даволі складаная. Будынак трохпавярховы, і дзяўчаты карысталіся рыштаваннем, каб працаваць на вышыні. Маляваць ім прыходзілася не на суцэльнай паверхні, а проста на цаглінах, што таксама не зусім зручна. І некалькі разоў прыходзілася затрымлівацца на аб'екце нават пасля заходу сонца, каб з дапамогай праектара перанесці малюнак на сцяну. Але, як прызналіся дзяўчаты, для іх гэта работа — перш за ўсё карысны вопыт, які яны заўсёды гатовы ўдасканаліць, тым больш што адміністрацыя школы паклапацілася аб бяспецы сваіх мастачак.

— Для нас супрацоўніцтва са школай было вельмі важнай справай, — адзначыў **дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ Армен САРДАРАЎ.** — Архітэктар павінен быць мабільны, выязджаць на месца, знаёміцца з людзьмі, мясцовасцю, ландшафтам. Мы ўключаем такія работы ў курсавое і пераддыпломнае праектаванне. Нашы студэнткі аднесліся да справы вельмі адказна — з'ездзілі ў Асіповічы, зрабілі эскізы з улікам пажаданняў адміністрацыі школы, усё ўзгаднілі і толькі потым пачалі працаваць. Малюнак сапраўды атрымаўся красамоўны, у ім закладзена вялікая сэнсавая нагрузка. Скарыць вяршыню не так проста. І шлях да ведаў таксама просты не бывае.



Матывам для арт-афармлення школы стала яшчэ адна важная для горада акалічнасць. Сёлета Асіповічы будуць прымаць героеў абласных «Дажынак», значыць, павінны выглядаць годна. Жыхары райцэнтра ўжо паспелі ацаніць арт-аб'ект і актыўна папулярызуюць яго ў сацсетках. Гэта значыць, што ў іх з'явілася яшчэ адна нагода для гонару за сваю малую радзіму.

Школа вельмі ўдзячная за дапамогу ў афармленні будынка адміністрацыі БНТУ. Тут спадзяюцца, што налета гэта супрацоўніцтва працягнецца, і на яшчэ адным фасадзе з'явіцца не менш сімвалічны малюнак. Педагогі пераканаexisting: знешняя прыгажосць выхоўвае і ўнутраную.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з архіва Асіповіцкай школы № 3.**

# КАГО ЧАКАЕ ГЛЫБІНКА

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Тым не менш адмовіцца ад размеркавання і атрымаць свабодны дыплом можна толькі ў выключных выпадках. Уважлівай прычынай лічыцца паступленне на больш высокі ўзровень адукацыі, напрыклад, у магістратуру, або для выпускніка каледжа — на ўзровень вышэйшай адукацыі першай ступені. Таксама гэта служба ў войску, пытанні, звязаныя з непрацаздольнасцю і здароўем. Па звестках Міністэрства адукацыі, усяго такіх каля сямі працэнтаў выпускнікоў.

Праўда, ёсць яшчэ адзін варыянт — выплаціць дзяржаве выдаткі за сваё навучанне. Яшчэ на этапе размеркавання выпускнік можа заявіць пра сваё нежаданне працаваць па размеркаванні ці мэтавым накіраванні і звярнуцца па разлік сумы сродкаў, выдаткаваных на яго навучанне, а пасля іх унясення — атрымаць даведку аб свабодным працаўладкаванні.

> Як ставіцца да будучага размеркавання — як да сацыяльнай перавагі або як да малапрыемнага абавязку — кожны вырашае для сябе сам. Але відавочныя плюсы ў яго таксама ёсць.

У Беларускім рэспубліканскім прафсаюзе работнікаў адукацыі і навукі канстатуюць: калі раней да іх звярталіся з пытаннямі «а чаму мы павінны плаціць?», то цяпер многія звароты ў прафсаюз гучаць прыкладна так: «Куды і колькі трэба заплаціць, каб не ехаць па размеркаванні?» А з улікам таго, што цяпер у агульную суму, якую трэба вяртаць дзяржаве за сваё навучанне, не ўваходзіць сума выплачанай стыпендыі і плата за інтэрнат, яна значна зменшылася. І моладзь вырашае зарабіць гэтыя грошы, але захаваць свабоду выбару...

**Выпускнікі, якія працуюць не па месцы жыхарства бацькоў у бюджэтных арганізацыях, маюць права на атрыманне льготнага крэдыту для набыцця рэчаў першай неабходнасці.**

## Нюансы мэтавай падрыхтоўкі

— Калі мы кажам пра тых, хто не прыязджае на першае рабочае месца без уважлівай прычыны, то лічбы тут невялікія. Напрыклад, па звестках аб вяртанні сродкаў (рашэнні, што прымаліся на ўзроўні ўстаноў адукацыі), у 2018 годзе гэта было крыху больш як 130 чалавек. Падобная лічба і па 2019 годзе, — паведаміў падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БелТА **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.**

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце за тры апошнія гады не прыступілі да работы пасля размеркавання ўсяго 15 выпускнікоў. З улікам таго, што за згаданы час было падрыхтавана амаль 2,5 тысячы спецыялістаў — гэта прыблізна 0,5 працэнта.

Між іншым, у тым выпадку, калі малады спецыяліст не прыступіў да работы ці звольніўся да заканчэння тэрміну абавязковай адпрацоўкі і не жадае вяртаць у бюджэт сродкі добраахвотна, грошы спаганяюцца з яго ў судовым парадку.

Для задавальнення патрэбу рэгіёнаў існуе таксама мэтавы набор. Мэтавае накіраванне гарантуе яго ўладальніку бясплатнае навучанне і стыпендыю, але «адмазацца» ад адпрацоўкі ці памяняць месца работы амаль нерэальна. Выпускнік мусіць адпрацаваць на прадпрыемстве, з якім ён і яго ВНУ заключылі дагавор. Напрыклад, перад паступленнем у педуніверсітэт малады чалавек падпісвае з аддзелам адукацыі дагавор і абавязуецца пасля заканчэння вучобы вярнуцца працаваць у родныя мясціны. І нават калі за час навучання змяніцца яго сямейнае становішча і жыццёвыя планы, пасля атрымання дыплома ён усё роўна будзе абавязаны туды вярнуцца.

Па-другое, калі працаваць па размеркаванні прыйдзецца пасля заканчэння ВНУ два гады, то па мэтавым накіраванні — аж пяць гадоў. Таму трэба добра падумаць, перш чым заключаць дагавор на мэтавую падрыхтоўку. Адпрацаваць пяць гадоў пасля размеркавання павінны будуць і выпускнікі педагагічных класаў, якія паступалі ва ўніверсітэт па выніках сумоўя без экзаменаў. Таму не ўсе рашаюцца скарыстацца такой ільготай, бо спрагназаваць сваё жыццё на столькі гадоў наперад праблематычна.

## Гарантыі для маладых спецыялістаў

Як ставіцца да будучага размеркавання — як да сацыяльнай перавагі або як да малапрыемнага абавязку — кожны вырашае для сябе сам. Але відавочныя плюсы ў яго таксама ёсць. Размеркаванне — гэта не проста гарантаванне выпускніку, які яшчэ не мае практычнага досведу, першага рабочага месца. Малады спецыяліст у гэтым выпадку падстрахаваны з усіх бакоў. Па-першае, наймальнік абавязаны даць яму работу па той спецыяльнасці і той кваліфікацыі, якая ўказана ў яго дыпломе і занатавана ў накіраванні. Але самая галоўная прывілея — абарона ад звальнення на працягу двух гадоў. Наймальнік не мае права ўстанаўліваць маладым спецыялістам выпрабавальны тэрмін і не можа звольніць маладога спецыяліста на аснове такой фармулёўкі, як «неадпаведнасць займаемай пасадзе ці выконваемай рабоце з прычыны недастатковай кваліфікацыі».


Фота БелТА.

**Калі спецыяліст размяркоўваецца не па месцы пастаяннай рэгістрацыі, яму належыць кампенсацыя ў сувязі з пераездам. Арганізацыя павінна пакрыць кошт праезду выпускніка і членаў яго сям'і, аплаціць выдаткі па перавозе багажу.**

Здараецца, што наймальнік падае заяўку на адну колькасць спецыялістаў, а яму накіроўваюць у два разы больш. І што хочаш з імі рабі — шукай ім работу.

— Маладому спецыялісту могуць прапанаваць занятасць на палову стаўкі, прычым не па атрыманай спецыяльнасці. У такім выпадку ёсць законныя падставы адмовіцца ад прапановы ды пайсці на пераразмеркаванне, — тлумачыць **галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК.** — Калі ж не змогуць пераразмеркаваць, павінны выдаць даведку аб самастойным працаўладкаванні. Дырэктар можа сказаць маладому спецыялісту, што калі той адмовіцца, то будзе абавязаны выплаціць дзяржаве грошы за сваё навучанне. Такія пагрозы можна смела ігнараваць. Калі мы сустракаемся з выпускнікамі, тлумачым ім, што <u>на работу іх павінны ўзяць па той спецыяльнасці, якая прапісана ў накіраванні на размеркаванне</u>.

## Правы і абавязкі

А ці можна адмовіцца ад размеркавання з прычыны адсутнасці ў патэнцыйнага наймальніка жылля?

Умова аб выдзяленні маладым спецыялістам жылога памяшкання наймальнікам можа быць агаворана ў накіраванні на работу і працоўным дагаворы (кантракце). Аднак забеспячэнне маладога спецыяліста жыллём — гэта права, а не абавязак наймальніка. Адзіная гарантыя ў гэтай сферы, замацаваная на дзяржаўным узроўні, — права маладога спецыяліста, які прыбыў па месцы размеркавання, стаць на ўлік асоб, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, без адпаведных патрабаванняў па неабходным тэрміне пражывання ў адпаведным населеным пункце. У тым ліку ў Мінску і Мінскім раёне.

**Цяпер пад абавязковае размеркаванне падпадаюць усе, хто праву чыўся на дзённай бюджэтнай форме навучання не менш за палову ад агульнага тэрміну навучання. Пры гэтым тэрмін работы па размеркаванні не змяншаецца прапарцыянальна часу навучання за кошт уласных сродкаў.**

**Калі студэнт больш за палову тэрміну вучыўся за кошт бюджэтных сродкаў, а затым пераведўся на платнае завочнае аддзяленне, то ён усё роўна трапляе пад размеркаванне. За выключэннем выпадку, калі ён працуе па сваёй спецыяльнасці.**

У наймальнікаў ёсць шмат магчымасцяў, каб падтрымаць маладога спецыяліста. Падтрымка можа заключацца як у асаблівых падыходах пры фарміраванні яго заробку, так і ў кампенсацыі аплаты за здымнае жыллё аж да вырашэння жыллёвага пытання ўжо на пастаяннай аснове.

— <u>Першае, што павінен зрабіць малады спецыяліст, які прыбыў на месца размеркавання, — гэта схадзіць у прафкам, дзе яму растлумачаць яго правы, і абавязкова трэба азнаёміцца з калектыўным дагаворам</u>, бо там ёсць важныя пункты, якія датычацца гарантый маладым спецыялістам, — раіць Ларыса Манюк. — Трэба азнаёміцца і са службовай інструкцыяй. У сістэме адукацыі ў маладых спецыялістаў ёсць выбар: заключыць кантракт або бестэрміновы працоўны дагавор. Звычайна ўсе выбіраюць кантракт, бо па ім прадугледжваецца павышэнне тарыфнай стаўкі (акладу) плюс даюцца дадатковыя дні адпачынку.

Між іншым, сёння і студэнты-платнікі, якія пажадалі размеркавацца, атрымліваюць тыя ж сацыяльныя гарантыі, прадугледжаныя для маладых спецыялістаў, што і выпускнікі бюджэтнай формы навучання. У прафсаюзе заўважылі, што яны часта нават больш зацікаўлены ў атрыманні першага рабочага месца, чым бюджэтнікі.

Рашэнне маладога спецыяліста застацца і далей працаваць па месцы размеркавання па заканчэнні двухгадовага тэрміну залежыць выключна ад зацікаўленасці наймальніка і ад створаных для жыцця і прафесійнага росту маладога спецыяліста ўмоў. Тым больш што даплаты і іншыя прэферэнцыі, устаноўленыя дзяржавай для маладых спецыялістаў, распаўсюджваюцца пераважна на работнікаў бюджэтных арганізацый і дзейнічаюць толькі на час іх работы па размеркаванні.

> Яшчэ на этапе размеркавання выпускнік можа заявіць пра сваё нежаданне працаваць па размеркаванні ці мэтавым накіраванні і звярнуцца па разлік сумы сродкаў, выдаткаваных на яго навучанне.

## Завышаныя чаканні

Калі казаць пра замацаванне маладых спецыялістаў, то тут трэба аналізаваць, колькі з іх працягнулі працоўную дзейнасць пасля тэрміну абавязковай работы па размеркаванні. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце пастаянна маніторац 23 раёны Мінскай вобласці: ад 80 да 100 працэнтаў выпускнікоў 2014, 2015 і 2016 гадоў засталіся ў сістэме адукацыі, замацаваўшыся на тых месцах, куды яны былі размеркаваныя. У Міністэрстве адукацыі сцвярджаюць, што ў сістэме адукацыі адзін з самых высокіх паказчыкаў па замацавальнасці маладых спецыялістаў: на першым месцы застаюцца і надалей працаваць не менш як 80 працэнтаў выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў.

**Па жаданні маладога спецыяліста ў тэрмін яго адпрацоўкі па размеркаванні можа быць уключаны тэрмін службы ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь ці водпуск па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Прычым, у водпуск па доглядзе дзіцяці можа пайсці як маці, так і бацька дзіцяці.**

Аднак, ёсць і іншыя назіранні: не ўсе наймальнікі зацікаўленыя ў так званым замацаванні маладых спецыялістаў. Па неафіцыйнай інфармацыі, якая паступае ад выпускнікоў, іх бацькоў і з прадпрыемстваў, многіх наймальнікаў у прынцыпе задавальняе такая сітуацыя, калі танная рабочая сіла ў асобе маладых спецыялістаў выкарыстоўваецца на працягу двух гадоў, а затым маладыя людзі звальняюцца, паколькі не бачаць перспектыў далейшай сваёй работы ў гэтай арганізацыі. Наймальнік таксама не бачыць у гэтым асаблівай праблемы, паколькі штогод па размеркаванні на месца выбылых ён зноў набірае маладых спецыялістаў.

Цікава, што маладыя людзі, якія толькі збіраюцца выйсці на рынак працы і звяртаюцца па дапамогу ці кансультацыю ў камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, арыентуюцца на заробак у тысячу — паўтары тысячы рублёў. Такія завышаныя чаканні моладзі — тэндэнцыя апошніх гадоў. А вось крытычнае стаўленне да сябе для многіх нехарактэрнае. Як заўважае Ларыса Манюк, розніцу паміж тым, што чакаюць маладыя спецыялісты, і тым, што яны атрымліваюць, апошнія ўспрымаюць сама меней як катастрофу. Таму моладзь трэба прывучаць да думкі, што перш, чым штосьці мець, трэба гэта зарабіць, і нічога з неба не падае.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ПРАБЛЕМА І РАШЭННІ

# «ЗЯМЛЯ І ТЭХНІКА, НАПРУЖАНАСЦЬ І РУХ...»

## Маладых спецыялістаў у сельскай гаспадарцы вабяць не толькі жыллё і зарплата

**У сельгаскааператыве «Ніва–2003» Гродзенскага раёна цяпер працуе ажно 11 маладых спецыялістаў. Праўда, у кіраўніцтве гаспадаркі не ўпэўнены, што ўсе яны застануцца тут і надалей. Хоць такі варыянт быў бы дарэчы, бо работнікаў у СВК не хапае. І ўсё ж тут аддаюць перавагу кадрам, якія асэнсавана абралі гэты шлях. А чым матывуюць свой выбар самі спецыялісты? На гэта і многія іншыя пытанні яны адказалі шчыра і не тоячыся.**



Павел БЫКОЎСКІ з галоўным аграномам Іванам МАЦЮКОМ.

### «Тут галоўнае — аддача»

У СВК «Ніва-2003» — гарачая пара. Гаспадарка завяршае ўборку, таму **галоўны аграном Іван МАЦЮК** пастаянна ў раз'ездзе. Ён спецыяльна пад'ехаў да праўлення, каб падвезці карэспандэнта «МС» у сад, дзе працуе адзін з тых самых маладых спецыялістаў, якія засталіся ў гаспадарцы пасля адпрацоўкі. І гэта вельмі добра, кажа галоўны аграном, стаж якога 40 гадоў, прычым менавіта ў «Ніве-2003». Прызнаецца, што раней было значна лягчэй з кадрамі, а зараз людзей не хапае. Пры гэтым аб'ём работы стаў яшчэ большы. Напрыклад, не так даўно пачалі культываваць сад.

Каля варот сада нас сустракае інтэлігентнага выгляду хлопец, больш падобны на айцішніка. Гэта і ёсць наш суразмоўнік — **садавод Павел БЫКОЎСКІ**.

Па сутнасці, яго гісторыя пачынаецца, як і ў многіх выпускнікоў-аграрнікаў. Атрымаў дыплом агранома, затым размеркаванне, армія, зноў адпрацоўка. На гэтым дачыненне хлопца да сельскай гаспадаркі магло скончыцца, як гэта адбылося з большасцю яго аднакурснікаў. Між тым Павел вырашыў застацца ў гаспадарцы, дзе яму даверылі адказную пасаду садавода.

Дарэчы, у садзе спецыяліст праводзіць увесь рабочы дзень, і нават звыш таго. Зараз адказная пара. Трэба рыхтавацца да ўборкі, а плошча сада немалая — больш за 80 гектараў. Тут і яблыні, і грушы, і слівы. Садавод кажа, што ёсць намер павялічыць плошчу — гэта дазволіць даць большы валавы збор. Але галоўнае, каб сад быў здаровы, бо калі садавіна не мае выгляду, яе цяжка прадаць, а гэта вельмі значны даход. Прадукцыю амаль што адразу адпраўляюць па Беларусі і ў Расію. Вядома, са сховішчам можна было б больш зарабіць, бо яблык зімой значна расце ў цане. Але пабудаваць такі аб'ект за ўласныя сродкі вельмі складана, кажа садавод.

Закранулі пытанне дэфіцыту кадраў. Сапраўды, такая праблема ёсць і на яго ўчастку. Зараз патрэбны работнікі, якія робяць сваю справу хутка і якасна. Гэта нават не столькі кваліфікаваныя кадры, колькі — адказныя.

— Але такіх, на жаль, мала. Бо трэба і працэс разумець, і мець жаданне працаваць. Тут цэлы ланцужок, дзе ад кожнага звяна залежыць канчатковы вынік. Вось як зрабіць, каб такіх людзей было як мага больш? — задаецца пытаннем садавод.

А між тым, зарплата, па словах суразмоўніка, тут дастойная. Вядома, трэба прыкласці намаганні, каб атрымаць ураджай. Прыходзіцца працаваць звыш нормы. Але такі напружаны рытм апраўданы — бачыш вынік сваёй працы.

— Калі мы ў гэтыя дні не папрацуем напружана, уся далейшая наша праца будзе бессэнсоўная. Бо калі ўраджай вырас, а мы не імкнёмся яго сабраць, то навошта ўсё астатняе? Аддача — галоўнае ў сельскай гаспадарцы. Да таго ж гэта не бясплатна. Той час, які работнік працуе звыш нормы, адпаведна аплачваецца, людзі атрымліваюць даплаты і прэміі, — зазначае Павел Быкоўскі.

— Відавочна, што ў маладога спецыяліста склаўся правільны падыход да працы ў сельскай гаспадарцы. Ці не сутыкаўся хлопец з прапановамі ад іншых гаспадарак? Зараз такая тэндэнцыя ёсць: багацейшыя сельгаспрадпрыемствы пераманьваюць спецыялістаў, якія добра сябе паказалі. Павел адказаў, што да яго такіх прапаноў не паступала, а калі б і былі, дык спакушацца на іх няма сэнсу, бо тут у яго ўласны дом, дзе яны жывуць з жонкай. Да таго ж садаводу важна ўпэўніцца ў сваіх выніках там, дзе ён пачаў працаваць.

### «Работа для мяне як хобі — а ад яго немагчыма стаміцца»

У адрозненне ад Паўла, аграхімік Дзяніс Красько пакуль нежанаты. Але жыве ў асобным катэджы, мае і службовы аўтамабіль, і ўласны. Прыгожы, упэўнены ў сабе хлопец. Што прывяло яго ў сельскую гаспадарку? Можа, для каго гэта і дзіўна, але зусім не матэрыяльная выгада, як аказалася. Хоць і жыллё, і зарплата таксама не на апошнім месцы. І ўсё ж Дзяніс, па яго словах, гатовы жыць у інтэрнаце і працаваць на зямлі. Можа, рамантык?

— Мне падабаецца работа на полі, і тэхніка, і гэта напружанасць, і гэты рух. Тут усё на відавоку, і твая работа таксама. А калі палі чыстыя, няма ніякіх хвароб у пасевах, разумееш, што ты робіш правільна. Таму тут справа не ў рамантыцы, а ў магчымасці самарэалізацыі, — заўважае Дзяніс. — Але галоўнае, трэба любіць працу на зямлі. Увогуле, любая работа будзе цяжкая, калі яна не падабаецца. Для мяне гэта як хобі, а ад хобі немагчыма стаміцца.



Дзяніс КРАСЬКО робіць замер вільготнасці зерня на сушыльным комплексе.

Мы гутарым з Дзянісам пасля яго начной змены на сушыльным комплексе. Падчас уборкі ўстанова працуе кругласутачна і трэба кантраляваць працэс. Прасушваць зерне не абавязкова, але патрэбна ачыстка, таму працуе толькі вентылятар. Зараз тут кіпіць работа — раз-пораз самазвалы прывозяць зерне з палёў. Ураджай сёлета высокі — 93 цэнтнеры з гектара.

Сам Дзяніс родам з Мастоў. Лічыць сябе гараджанінам, але марыў працаваць у сельскай гаспадарцы. Бабулі казаў, што будзе старшынёй калгаса. Праўда, была спроба стаць урачом, нават паступіў у Гродзенскі медуніверсітэт. Але доўга падманваць самога сябе не атрымалася — дзіцячая мара перамагла, і хлопец пайшоў вучыцца на агранома ва ўніверсітэт. Калі паступіла прапанова размеркавацца ў СВК «Ніва-2003», пагадзіўся. І вось другі год праходзіць, што называецца, адпрацоўку.

— Прыехаў, азнаёміўся з работай. Гаспадарка даволі трывалая. Ад Гродна 15 кіламетраў. Жыллё адразу паабяцалі — асобны катэдж, вялікі ўчастак. Пражыванне з правам выкупу, — пералічвае бонусы хлопец.

І ўсё ж ніякія выгоды не прыцягнуць маладога спецыяліста да зямлі, калі ў яго не будзе на гэта жадання. А такіх ахвотнікаў сёння няшмат. Як правіла, моладзь ідзе вучыцца дзеля вышэйшай адукацыі, і мала хто сапраўды мяркуе звязаць свой лёс з сельскай гаспадаркай. Нават аграномы знаходзяць работу ў іншай сферы, кажа малады спецыяліст. Дзяніс жа бачыць сябе толькі ў аграрным сектары, прычым менавіта ў згаданым сельгаспрадпрыемстве.

— Важна, каб чалавек ішоў працаваць у сельскую гаспадарку свядома, тады больш шанцаў, што ён адтуль не сыйдзе, — упэўнены малады аграном. — Наш старшыня ўмее стымуляваць — па-першае, дом, па-другое, зарплата. Таксама заўсёды можна параіцца з больш вопытнымі спецыялістамі, атрымаць патрэбную дапамогу.

### «Калі не пастараешся, застанешся без кадраў»

**Старшыня СВК «Ніва–2003» Руслан ГАМАНЧУК** — малады, сучасны кіраўнік. Ён разумее, што добрыя вынікі немагчымыя без належнай арганізацыі рабочага працэсу. Для гэтага патрэбны, у першую чаргу, кваліфікаваныя кадры.

На сённяў гаспадарцы працуе адзінаццаць маладых спецыялістаў. Яшчэ шэсць чалавек вучыцца па мэтавым накіраванні і праз некалькі гадоў вернуцца сюды.

— Калі з гэтай колькасці застанецца хоць бы двое пасля адпрацоўкі, гэта ўжо будзе дасягненне, таму што сёння як ніколі адчувальны кадравы голад у сельскай гаспадарцы. Пакуль у нас замацаваліся толькі два малады спецыялісты. Усе астатнія збягаюць пасля адпрацоўкі. Хоць мы і жыллё даём, і зарплата па гаспадарцы добрая, і дапамагаем, і прадугледжаны сацыяльныя выплаты. Напрыклад, на васелле выдзяляем 50 базавых. Ёсць пад'ёмныя для тых, хто вяртаецца з арміі. Імкнёмся падтрымаць, каб яны заставаліся, — выказвае сваю пазіцыю Руслан Яўгенавіч.

Чаму ж маладыя з'язджаюць з вёсак? Гэта пытанне пакуль застаецца ў старшыні без адказу. Магчыма, справа ў гаспадарскай жылцы? Дакладней, у яе адсутнасці.

З такой думкай Руслан Гаманчук згодны. Пры гэтым няма ніякай розніцы — гарадскі гэта жыхар ці вясковы. І сапраўды, сам старшыня — карэнны гродзенец, але звязаў свой лёс з АПК. Было б жаданне працаваць...

— Правільна, што зроблены профільныя аграрныя клас. У нашай Раціцкай школе ён таксама ёсць, і мы будзем даваць накіраванне аднаму з вучняў, які падаў дакументы ў Гродзенскі аграрны ўніверсітэт. Вядзём дыялог з яго бацькамі, з ім самім, каб ён вучыўся менавіта па мэтавым накіраванні. Тады будзе гарантыя, што ён прыйдзе да нас і адпрацуе пяць гадоў. Нашы мэтавікі вучацца і на агранома, і на заатэхніка, і на ветэрынара. Калі не праводзіць работу, не напружвацца, можна застацца без кадраў, — лічыць кіраўнік гаспадаркі.

Разам з тым прывабіць кадры лягчэй той гаспадарцы, дзе аддаюць увагу тэхнічнаму боку, сучаснай сістэме земляробства. Кваліфікацыя механізатара павінна быць значна вышэйшая, чым раней. Затое і працаваць моладзі цікавей. Праўда, падрыхтаваць такія кадры не заўсёды ўдаецца, бо тэхніка, асабліва замежная, здараецца, апярэджвае тыя веды, што даюць сёння навучальныя ўстановы. А трэба ісці ў нагу з часам. Іншага шляху няма, рэзюмуе свой пункт гледжання кіраўнік гаспадаркі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

### Каментарый у тэму

**Іван ДАРАШКЕВІЧ, прарэктар Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта:**

— Запатрабаванасць у кадрах значна вышэйшая, чым можа забяспечыць універсітэт. Не так даўно мы рабілі аналіз, як выпускнікі замацоўваюцца, аказалася, што не больш за 25—30 % засталіся пасля адпрацоўкі. Таму кадры трэба пастаянна аднаўляць.

Сёлета выпушчана 380 маладых спецыялістаў па лініі бюджэту, амаль 300 размеркавана. А вось заяў ад кіраўнікоў сельгаспрадпрыемстваў паступіла каля 860. Атрымліваецца, што яшчэ 560 вакансій, ці больш за палову, застаюцца адкрытыя. Найбольш запатрабаваныя заатэхнікі і ветэрынары. На заатэхнію было 40 выпускнікоў, а паступіла амаль 200 заявак. На ветэрынарнай медыцыне было 47 біёджэтнікаў, а заявак 226. Лічы, задаволена толькі кожная пятая заяўка.

Універсітэт улічвае такі высокі попыт на спецыялістаў, таму сёлета мы напалову павялічылі набор на самыя запатрабаваныя спецыяльнасці. На ветэрынарыі давялі набор да 100 чалавек, па заатэхніі прыбавілі да 80.

На хвалі

# ПАЗНАЮ Я ІХ ПА ГАЛАСАХ

**Да 95-годдзя Беларускага радыё канал «Культура» запусціць у эфір айчынныя радыёспектаклі, якія былі запісаны ў апошнія гады.**

У студыі сталічнага Дома радыё, згадвае дырэктар радыё «Культура» Уладзімір Трапянок, створаныя сотні арыгінальных пастановак і радыёверсій вядомых тэатральных спектакляў, многія беларускія акцёры менавіта дзякуючы радыётэатру атрымалі папулярнасць і народную любоў. «У цяперашнім стагоддзі колькасць радыёспектакляў зменшылася, аднак тыя, што запісваюцца, уваходзяць у катэгорыю здабыткаў сучаснага літаратурна-драматычнага радыёвяшчання», — кажа ён.

Менавіта гэтыя сучасныя запісы ўжо ў верасні пачнуць выходзіць у суботнім эфіры «Культуры» — у межах праграмы «Радыётэатр. Лепшае». Адкрые сезон радыёспектакль «Ігнатаў рубеж» па п'есе Васіля Ткачова, што быў пастаўлены ў 2006-м і прымеркаваны да 20-годдзя катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (у ролях — цэлы зорны россып вядомых акцёраў, у тым ліку народныя артысты СССР — Генадзь Аўсяннікаў і Беларусі — Марыя Захарэвіч, Арнольд Памазан, Зінаіда Зубкова). Далей у афішы стаяць пастаноўкі «Паэт і дзяўчына» па п'есе Пятра Васючэнкі, «Крыж» па п'есе Аляксея Дударава і «Пастка» паводле Васіля Быкава. Як і раней, кожны выпуск праграмы «Радыётэатр. Лепшае» цягам месяца будзе дасяжны ў электронным архіве на сайце www.radiokultura.by.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Тэлесеткі

# ДАТЫ, ЛЮДЗІ І КАДРЫ

**На наступным тыдні тэлеканал «Беларусь 3» прапануе гледачам успомніць пра дні народзінаў вядомых дзеячаў культуры.**

17 жніўня народнаму артысту СССР Алегу Табакову магло б споўніцца 85 гадоў. Да гэтай даты ў эфір выйдзе меладрама «Калі можаш, прабач...» з удзелам славутага акцёра.

18 жніўня да дня нараджэння беларускага мастака Аляксандра Ксяндзова выйдзе адмысловы выпуск праграмы «Майстэрня. Гісторыя аднаго мастака».

20 жніўня, у дзень нараджэння акцёра, рэжысёра і сцэнарыста Івана Паўлава, тэлеканал пакажа адну з яго рэжысёрскіх работ — камедыю «На спіне ў чорнага ката».



А 23 жніўня, ушаноўваючы памяць народнага паэта БССР Пімена Панчанкі, стваральнікі дакументальна-біяграфічнага праекта «Запіскі на палях» прапануюць паглядзець серыю «Пімен Панчанка: сінія касачы для паэта-філосафа».

## ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 120

На платформе lidraughts.org працягваецца міжнародны анлайн-турнір пад эгідай FMJD — Кубак нацый па шашках-100. Жаночая зборная Беларусі на папярэднім этапе заняла трэцяе месца сярод 11 камандаў і трапіла ў плэй-оф, дзе ў 1/4 фіналу ў двух матчах перамагла каманду Латвіі на чале з 16-разовай чэмпіёнкай свету Зояй Голубевай з лікам 4—4, 5—3. У паўфінале наша каманда згуляе з Украінай.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі, складзеныя вядучым аддзела. № 78—80 — па правілах бразільскіх шашак (як у шашкі-100), № 81—83 — па правілах рускіх шашак.

№ 78



**№ 78**

**Белыя простыя шашкі:** c1, e1, f2, h2, f4, g5 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a5, c5, e7, g7, h8 (6)

**№ 79**

**Белыя простыя шашкі:** a1, g1, d2, h2, d4, f6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, h4, a5, e5, c7, b8 (6)

**№ 80**

**Белыя простыя шашкі:** c1, f2, h2, f6. Белыя дамкі: h4 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** b2 , c3, d4, c5, e5. Чорныя дамкі: a3 (6)

**№ 81**

**Белыя простыя шашкі:** c3, e3, d4, h4, e5. Белыя дамкі: a7 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** h2, a3, f6, h6, e7, g7, d8 (7)

**№ 82**

**Белыя простыя шашкі:** g1, h2, e3, d4, c5, h6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, f2, h4, a7, g7, b8, f8 (7)

**№ 83**

**Белыя простыя шашкі:** g3, b4, d4, c5, g5, d6 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** b2, d2, a3, g7, b8, f8 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:**

**Выпуск №** 119 ад 31.07.20.

№ 73 1.f2-e3 h4-g3 2.e3:g5 c5:c1 3.h2:f4 c1-d2

[3…b6-c5 4.g5-h6 c1:g5 5.h6:f4 c5-d4 6.a3-b4]

4.g5-h6 d2:g5 5.h6:f4 b6-c5 6.f4-e5+

**№ 74** 1.g7-f8 c1:g1 2.f8:c5 g1:b6 3.a5:c7 b8:d6 4.h4:f2 a7-b6 5.b4-c5 d6:b4 6.f2-e3 f4:d2 7.e1:c7+

**№ 75** 1.b4-c5 d6:b4 2.a5:g3 a7:c5 3.g3-f4 e3:g5 4.h6:f4 c5-d4 5.a3-b4+

**№ 76** 1.44-39 33:44 2.30-24 19:39 3.05:34 48:30 4.35:33 44:35 5.49-44 25-30 6.33-29 30-34 7.29:40+

**№ 77** 1.47-42 14:34 2.25:05 38:47 3.49:40 47:20 4.05-10 15:04 5.40-34 39:30 6.35:15+

Першымі дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



Сядзі і глядзі

# УСХОД — СПРАВА ТОНКАЯ...

## «Беламу сонцу пустыні» — 50 гадоў

**Фільм Уладзіміра Матыля ў жанры істэрн, які яшчэ называлі «чырвоным вестэрнам», выйшаў на экраны СССР у 1970-м. Выйшаў амаль выпадкова, бо не спадабаўся кіраўніку студыі «Масфільм», але атрымаў ухваленне Леаніда Брэжнева, які вельмі любіў вестэрны і прыйшоў ад новай карціны ў захапленне. У пракаце ў той год фільм заняў другое месца па зборах, палюбіўся гледачам і ўвайшоў у залаты фонд, а вось узнагароды — Дзяржпрэміі РФ — чакаў 28 гадоў.**

...Сцэнарый карціны пад рабочай назвай «Басмачы» ўсё ніяк не вымалёўваўся — адзін варыянт не прыняла кінастудыя, для другога аўтары ніяк не маглі знайсці пункт адліку, пакуль не пачулі ад камбрыга Грамадзянскай вайны гісторыю пра басмача, які кінуў свой гарэм каля калодзежа ў пустыні. Тады назву замянілі на «Выратуйце гарэм» і прыдумалі напаўанекдатычны, напаўгераічны сюжэт пра чырвонаармейца Сухава, вымушанага ў пясках Сярэдняй Азіі ўзяць пад абарону гарэм басмача па мянушцы Чорны Абдула.





На ролю Фёдара Сухава прэтэндавалі два акцёры — славуты Георгій Юматаў і малавядомы Анатоль Кузняцоў. За Юматава быў мастацкі савет, аднак падвялі праблемы з алкаголем: літаральна напярэдадні здымак акцёр увязаўся ў бойку і з'явіўся з разбітым тварам... А вось ролю мытніка Верашчагіна рэжысёр адмыслова перапрацаваў пад Паўла Луспякаева, зрабіўшы з нікчэмнага выпівохі хоць і састарэлага, але ўсё яшчэ моцнага і прынцыповага асілка. На той час ужо вельмі хворы, з ампутаванымі часткамі ног, Луспякаеў сам выканаў у фільме ўсе трукі — каскадзёр падмяняе яго толькі ў некалькіх кадрах, калі мытнік нагамі выпхаў басмачоў за борт баркаса, і на буйным плане было б відаць змятыя пустыя наскі ботаў. Дарэчы, песню «Ваша высакароддзе, спадарыня Удача» выдатны тандэм аўтараў Ісака Шварца і Булата Акуджавы таксама пісаў адмыслова «пад Луспякаева».

Ролю Чорнага Абдулы (які, паводле канонаў добрага героя і злыдзея, носіць чорную чалму ў процілегласць белай фуражцы Сухава) сыграў Кахі Каўсадзэ — каларытны акцёр Тбіліскага акадэмічнага тэатра. Саіда рэжысёр разгледзеў у Спартаку Мішуліну, папулярным на той час як... Карлсан у спектаклях Тэатра сатыры. А на ролю чырвонаармейца Пятрухі зацвердзілі наогул не акцёра — Мікалай Гадавікоў працаваў слесарам на заводзе. Сярод дзевяці жонак Адбулы толькі тры — прафесійныя актрысы, астатнія дзяўчаты — філолаг, прадавец, спартсменка, інжынер, мастацтвазнаўца; калі ж на здымках было асабліва спякотна, дзяўчат адпускалі, а замест іх хадзілі салдаты з мясцовай воінскай часці, закрываючы паранджой твары. Але найбольш давялося пабегаць за Кацярынай Мацвееўнай: дзясяткі актрыс не прайшлі пробы, а патрэбная фактура знайшлася выпадкова на «Ленфільме» — Галіна Лучай працавала рэдактарам праграмы «Кінапанарама». Але ногі ў яе былі занадта худыя, і іх «прыставілі» асобна, спытаўшы дазволу ў іншай, больш мажнай жанчыны.

Дэкарацыі гарадка Педжэнт, дзе праходзіла большая частка падзей, спачатку збудавалі ў Дагестане, на заходнім узбярэжжы Каспія, а другую частку здымалі ўжо на ўсходнім беразе блізу горада Байрам-Алі. Пустыню Каракумы, дарэчы, перад гэтым давялося прапалоць з дапамогай ваенных, бо з-за частых дажджоў пясок пакрыла густая трава.

Кажуць, адну з крылатых фраз «Я хабар не бяру, мне за дзяржаву крыўдна!» рэжысёр прыдумаў, вяртаючыся пасля чарговых перамоў з мясцовай уладай, прадстаўнікі якой вельмі стараліся «прапхнуць» сваіх дзяцей у фільм, дзе ролі басмачоў выконвалі мясцовыя хлопцы. А вось іншую славутую фразу «Мытня дае дабро» вымаўляе ў кадры сапраўдны крымінальны аўтарытэт Алі — яго рэжысёр запрасіў у карціну для бяспекі кіношнікаў, пасля таго як у Дагестане здымачную групу абрабавалі.

Калі здымалі сцэны з закапаным у зямлю Саідам, тэмпература пяску дасягала 75 градусаў! Каб акцёр не спёкся жыўцом, змайстравалі драўляную скрыню, у якую залазіў Мішулін, а шыю прысыпалі мокрым пяском. Вылезці з гэтай канструкцыі было праблематычна, таму ў перапынках акцёра не адкопвалі, а кармілі з лыжкі.

...Карціну купілі для пракату ў 130 краінах. Не паказвалі яе мо толькі ў Марока — ці жартам, ці ўсур'ёз работнікі пасольства казалі, быццам тамтэйшаму каралю стала крыўдна, што ў ягоным гарэме ўсяго дзве жонкі, а ў простага рускага салдата — дзевяць.

Калі пераглядзець: АНТ, 16 жніўня, 23.35.

Фота: museikino.ru.

### Сказана!

— Пытанні ёсць? Пытанняў няма.

— Зарына, Джаміля, Гюзель, Саіда, Хафіза, Зухра, Лейла, Зульфія, Гюльчатай... Гюльчатай! Напра... За мной, паненкі.

— Зноў ты мне гэту ікру паставіла. Не магу я яе штодня, праклятую, есці! Хоць бы хлеба дастала.

— Гюльчатай, адкрый тварык, а?

— Ты як тут апынуўся? — Стралялі...

— Гаспадар прызначыў мяне любімай жонкай!

— Вось што, хлопцы, кулямёт я вам не дам.

## Беларусь 1

**6.20 Меладрама «Неспадзяваныя акалічнасці». 3-я і 4-я серыі (16+).**
8.15 Клуб рэдактараў (16+).
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.50 Гісторыі выратавання (12+).
10.30 Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
11.10 Вакол планеты.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «Вядзьмарскае возера». 1-я і 2-я серыі (16+).**
14.25 Маршрут пабудаваны (12+).
15.15 Твой горад.
15.30 Адзін дзень (12+).
16.05 Лёс гігантаў.
**16.45, 19.10 Меладрама «Абавязкі сумлення». 1—4-я серыі (16+).**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Спальваючы масты». 1—4-я серыі (16+).**

## Беларусь 2

**7.00 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**8.40 Серыял «Стыч!» (6+).**
9.25, 19.40 Тэлебарометр.
9.30 «Супержонка» (16+).
10.20 «Чатыры вяселлі» (16+).
11.40 «Пагоня за смакам». (16+).
**12.30 Баявік «Прага хуткасці» (12+).**
14.40 «Тата папаў» (16+).
17.05 «Вежа» (12+).
**17.55 Драма «Усё яшчэ Эліс» (16+).**
20.10 «Арол і Рэшка. Марскі сезон» (16+).
21.10 Спартлато 5 з 36, КЕНО.
**21.15 Трылер «Астрал-3» (16+).**
23.05 «Трэці лішні» (16+) [СЦ].
0.05 «Муж напракат» (16+).

## Беларусь 3

7.35 «Святыні Беларусі».
8.00, 13.30, 20.20 Навіны культуры.
8.20 «Гэты дзень».
**8.25 «Тры таўстуны». Маст. фільм (6+).**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.25 «Беларуская кухня». Бонды з юшкай.
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
**11.45 «Халоднае лета пяцьдзясят трэцяга...» Маст. фільм (16+) [СЦ].**
13.50 «Камертон». Уладзімір Громаў.
14.15 Дж. Пучыні. «Багема». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.
16.05 «Нататкі на палях». Пімен Панчанка: сінія касачы для паэта-філосафа [СЦ].
16.35 Канцэрт «Славянскі базар — 2020».
18.35 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**18.50 «Будзьце маім мужам». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Фурцава». Серыял (16+).**

## Беларусь 5

6.30 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 22-ы тур. «Дынама-Брэст» — «Белшына» (Бабруйск).
8.15, 10.50, 18.00 Тэніс. WTA. Цынцынаці.
9.50, 12.20 Біятлон. Кубак федэрацыі. Другі этап. Гомель.
13.30 Гандбол. Кубак Беларусі. Мужчыны. Матч за 3-е месца.
15.10 Спорт-мікс.
15.20 Трэніровачны дзень.
15.50 Гандбол. Кубак Беларусі. Мужчыны. Фінал. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
17.30 Піт-стоп.
19.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. 22-ы тур. «Нёман» (Гродна) — БАТЭ (Барысаў). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
21.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Фінал. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
0.20 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.

## АНТ

7.00, 9.00, 16.00 [СЦ], 18.00 Навіны.
7.10 «Спадчына» (12+).
8.05 «Жыццё іншых» (12+).
9.10 «Нядзельная споведзь» [СЦ].
9.25 «Метэагід».
9.45 «Народны кухар» (12+).
11.00 «Бачылі відэа?» (6+)
12.45 «На дачу!» (6+)
**14.00 Серыял «Тонкі лёд» (16+).**
**16.20 Фільм «Вяселле па абмене» (12+).**
18.15 «Тры акорды» (16+).
20.00 «Контуры».
21.20 Да 25-годдзя Першага канала. Кропля ў кроплю». Лепшае (16+).
23.20 «Спартклуб» (16+).
**23.40 Маст. фільм «Формула кахання» (6+).**

## СТБ

6.00, 23.45 «Ежа багоў» (16+).
7.40, 20.50 Дакументальны спецпраект (16+).
9.25 «Мінтранс» (16+).
10.00 «Скардзіцца дазваляецца».
10.30 «Вялікі горад».
11.00 Дакументальны праект (16+).
**11.30, 13.40, 16.40 «Нюхач-3». Серыял (16+).**
13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
22.30 «Засакрэчаныя спісы» (16+).

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Помста і закон» (12+).**
**6.00 Мультфільмы (6+).**
**7.10 Маст. фільм «Фініст — ясны сокал» [СЦ] (16+).**
8.50 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
9.25 «Фазендалайф» (12+).
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.10 Серыял «Кіпцюр з Маўрытаніі». [СЦ] (16+).**
**14.10, 16.15 Серыял «Кіпцюр з Маўрытаніі-2». [СЦ] (16+).**
**18.25 Серыял «Страсці па Чапаю». [СЦ] (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Раман з мінулым» (12+).**
**10.20, 11.30 Маст. фільм «Зводная сястра» (12+).**
11.00, 20.00 Весткі.
**14.20, 21.15 Серыял «Замак з пяску» (12+).**
23.00 «У людзях».
23.30 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05 Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
6.40 «50 рэцэптаў першага» (12+).
7.15 «Хто ў хаце гаспадар?» (12+).
8.00, 10.00 Сёння.
8.20 «24 пытанні» (12+).
8.55 Беларусы (6+).
9.25 «Я жадаю гэта ўбачыць!» (6+).
10.25 «Першая перадача» (16+).
10.55 Цуд тэхнікі» (12+).
11.45 «Дачны адказ» (0+).
12.45 «НашспажыўНагляд» (16+).
13.45 Гісторыі выратавання (12+).
**14.15 Маст. фільм «Іспанец» (16+).**
16.00 Сёння.
16.20»Следства вялі...» (16+).
19.00 «Вынікі тыдня».
20.10 Ты не паверыш! (16+).
21.05 «Зоркі сышліся» (16+).
22.30 «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).

## 8 канал

7.00, 14.05, 15.55, 21.15 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 «Мульт-парад». «Том і Джэры. Квэст».
8.20, 15.50 «Прыколы 13-й школы» (6+).
8.25 «Гатуй як шэф!» (12+)
**8.45 Трылер «Зорныя войны».**
**11.05 Меладрама «Спадчынніца паняволі».**
14.10 «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф.
**16.00 Дэтэктыў «Таямніца Эйфелевай вежы».**



**18.00 Серыял «Касл» (12+).**
18.45, 1.20 «Надвор'е».
**18.50 Меладрама «Дзённік памяці» (16+).**
20.55 «Вечарніца».
**21.20 Драма «Халоднае танга» (18+).**
**23.05 Трылер «Водны мір» (16+).**









## ВТБ

6.05 «Дурніі дарогі» (16+).
7.20 «Лаві момант» (16+).
8.35 «Галерэя прыгажосці» (16+).
9.20 Баявік «Легенда Зора» (12+).
11.45 «Даеш моладзь» (16+).
12.45 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
13.45 «Наш рамонт» (16+).
14.25, 2.30 Серыял «Маладзёжка» (16+).
16.25 Фантастыка «Рыдзік» (16+).
18.45, 0.25 «Уральскія пельмені» (16+).
19.30 Серыял «Сторыз» (16+).
20.30 Серыял «Нагіеў на карантыне» (16+).
21.30 Серыял «Гатэль «Элеон» (16+).
23.00 Серыял «Матулі» (16+).
1.20 Серыял «Татавы дочкі» (12+).
4.10 «Адна за ўсіх» (16+).
4.45 «6 кадраў» (16+).

## Культура

6.30 Лісты з правінцыі. Рэспубліка Паўночная Асеція — Аланія [СЦ].
7.00 Легенды сусветнага кіно. Данатас Баніоніс.
7.30, 19.45, 1.35 «Чалавек і Сонца». Дак. фільм.
8.20 Колер часу. Каравайджа.
8.35 «Цыган». Маст. фільм [СЦ].
10.00, 19.30 Навіны культуры.
10.15 «Шэрыя кіты Сахаліна». Дак. фільм.
10.55 Штучны адбор.
11.35 Academia. Галіна Шышкіна. «Японская культура як шлях эстэтычнага і духоўнага ўдасканалення». 1-я лекцыя.
12.25 «Старэйшы брат. Акадэмік Мікалай Багалюбаў». Дак. фільм.
13.05 «Забытае рамяство». Дак. серыял. «Катрыншчык».
13.20, 0.55 «Даведнік па аркестры Юрыя Башмета». Дак. серыял. 1-я серыя.
14.00 Прыгожая планета.
14.15, 20.55 85 гадоў з дня нараджэння Алега Табакова. «У пошуках радасці. Тэатральная аповесць у пяці вечарах». Вечар 1-ы [СЦ].
14.55 «Прыгажун-мужчына». Маст. фільм [СЦ].
17.05 «Тры таямніцы адваката Плевака». Дак. фільм.
17.35 «Кнігі, якія зазірнулі ў будучыню». Дак. серыял.
18.05 Замежная справа. «Дыпламатыя Старажытнай Русі».
18.45 Астравы. Павел Коган і Людміла Станукінас.
20.30, 23.10 Колер часу.
20.40 «Добрай ночы, малыя!»
21.35 Спектакль МMT імя А. П. Чэхава «Юбілей ювеліра». Пастаноўка Канстанціна Багамолава. Запіс 2017 года.
23.20 Тайная гісторыя разведкі. «Сола для адзінокіх соваў. Энтані Блант». Дак. серыял. 1-я серыя.
0.00 «Адчайныя рамантыкі». Маст. фільм. 1-я серыя. (18+).
2.15 «Адлюстраваны час». Дак. серыял. «Аповед пра чатырох салдат».
2.45 Pro memoria. «Венецыянскае шкло».

## Настальгія

6.10 «Да і пасля...» 2009 год (12+).
7.05 Маст. фільм «Іншаземка» (6+).
8.15, 20.15 «Мы пяем вершы...» (12+).
9.00 «Быў час» (16+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР» (12+).
10.55, 11.40, 15.40, 16.55, 18.50, 21.45, 22.55, 2.20, 3.45, 5.15 Музычная настальгія (12+).
11.30, 5.45 «Паэт Генадзь Айгі чытае свае вершы» (16+).
12.00 Маст. фільм «Вязень замка Іф». 1-я серыя: «Абат Фарыя» (16+).
13.00 Маст. фільм «Вязень замка Іф». 2-я серыя: «Граф Монтэ Крыста» (16+).
14.05 Маст. фільм «Вязень замка Іф». 3-я серыя: «Я адплачу» (16+).
18.00 The Best of «СевАлогія» (18+).
19.05 Маст. фільм «Падарунак лёсу» (16+).
21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
0.10 «Да і пасля...» (12+).
1.00 Маст. фільм «Нікола» (16+).

## EuroSport 1

1.00 Ралі. ERC. Латвія. Агляд (12+).
1.30, 14.00, 23.00 Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ» (12+).
2.30, 18.00 Веласпорт. «Тур Ламбардыі» (12+).
4.00 Аўтагонкі. Суперкубак Porsche (12+).
6.00,19.00 Тэніс. US Open — 2019 (6+).
9.30 Снукер. Чэмпіянат свету (6+).
15.20, 22.00 Веласпорт. «Тур Валоніі» (12+).

## Кінакамедыя

0.30 Нянькі (16+).
2.20 1+1 (16+).
4.30 Каманда мары (16+).
6.15 Каханне жыве тры гады (16+).
8.15 Фанаткі на сняданак не застаюцца (16+).
10.10 Чорны рыцар (12+).
12.00 Чалавек, які занадта мала ведаў (16+).
13.50 Разборкі ў стылі кунг-фу (16+).
15.45 Бандыткі (16+).
17.30 Вышэйшая ліга (16+).
19.30 2+1 (16+).
21.40 Захачу і саскочу (16+).
23.40 Рэд-2 (12+).

## ТБ3

6.00 Калекцыя Беларусьфільма (12+).
8.10 М/ф (6+).
10.15 «M&S» (12+).
10.45 «Перыскоп» (16+).
11.05, 4.30 «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
12.05, 18.45 «Сляпая» (16+).
13.10, 0.15 «Бітва за спадчыну» (16+).
14.00 «Сезон пасадак». Маст. фільм (12+).
15.45 «Чалавек-невідзімка» (16+).
16.45 «Апакаліпсіс» (12+).
17.50, 3.45 «Развітанне» (16+).
19.50 «Відавочнікі» (16+).
20.30, 2.55 «Споведзь экстрасэнса» (12+).
21.30 «Косткі». Серыял (16+).
23.20 «Вечнасць». Серыял (16+).
1.05 «Д'ябал носіць Prada». Меладрама (16+).
3.45 «Развітанне» (16+).

## ТБ1000

7.00, 5.00 Неверагодныя прыгоды факіра (16+).
8.45 Востраў (12+).
11.00 Валерыян і горад тысячы планет (16+).
13.25 Як выкрасці хмарачос (12+).
15.15 Вобласці цемры (16+).
17.05 Прыгоды Цінцына: таямніца Аднарога (12+).
19.00 Сардэчна запрашаем у Zомбілэнд (16+).
20.30 Бібліятэкар: у пошуках дзіды лёсу (16+).
22.10 Што хавае хлусня (16+).
23.45 Гонка стагоддзя (16+).
1.30 Шалёныя грошы (16+).
3.10 Нябачны (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

7.00 8 новых спатканняў (12+).
8.30 8 лепшых спатканняў (12+).
Аляксандр Сарынаў (ва ўзросце крыху за дваццаць) разважае як вопытны чалавек. Расказаў пра родны райцэнтр, дзе ў 2014-м скончыў дзевяць класаў. Пра вучобу ў аграрным каледжы. Пра тое, як у воінскай часці ў знакамітых Пячах быў сяржантам. Мог бы застацца ў арміі, бо вельмі адказныя прафесіяналы неабходны і там, але пацягнула дамоў.

З любоўю гаварыў аб прадпрыемстве, сваіх абавязках, пра тое, што прапанавалі вучыцца на інжынера. Плануе стаць студэнтам аднаго з прэстыжных мінскіх ВНУ. Прызнаўся, што на асабістае жыццё пакуль няма часу, але ў любым выпадку, калі сустрэне тую адзіную, то створыць сям'ю, застанецца ў Гарадку...

Чарговым новым знаёмым стаў 25-гадовы аграном Мікалай Жукоўскі. Сказаў, што раней працаваў на Браслаўшчыне, дзе нарадзіўся і жыў. Сюды трапіў, калі расфарміравалі гаспадарку, а выбар зрабіў дзякуючы аднакурсніцы, з якой вучыўся ў акадэміі — яна тутэйшая.

Пагутарылі і з лідарам жніва сярод маладых Дзмітрыем Шапавалавым. Усё ў яго складваецца добра. І на рабоце шануюць,



Ганна ШАЛАЕВА кіруе гуртком ганчарства.

бо не лянуецца. А дома чакаюць жонка і двое дзетак.

А ў Міхаіла Саламахі быў якраз дзень нараджэння: яму споўнілася 32 гады. Летась на ўборцы стаў «бронзавым прызёрам». Прафсаюзны лідар павіншавала Міхаіла, уручыла памятныя сувеніры ды пажадала сямейнага шчасця, бо механізатар халасты. Умовамі працы ён задаволены. Напрыклад, гарачую ежу прывозяць у абед, і за гэта трэба заплаціць усяго 20 % ад кошту.

**Старшыня прафсаюзнага камітэта ААТ «Птушкафабрыка Гарадок» Вольга ЛЮКШЫНА** расказала, што ўсяго на прадпрыемстве працуе прыкладна 600 чалавек. Моладзь на асаблівым рахунку. Усё больш моладзі сярод кіраўнікоў. Спецыялістам, у якіх зацікаўлена прадпрыемства, аказваюць дапамогу, напрыклад, у набыцці мэблі.

Навіна на прадпрыемстве — пачынае функцыянаваць сартавальная машына замежнай вытворчасці. І, як кажуць спецыялісты, яна адна з самых інтэлектуальных ва ўсёй краіне. Якія, дзякуючы ёй, будуць мець лепшы таварны выгляд, іх тэрмін прыдатнасці павялічыцца. Каля дваццаці пяці чалавек, якія да механізацыі працэсу займаліся сарціроўкай яек, атрымаюць работу на прадпрыемстве.

## Лечаць, пішуць, малююць...

У Гарадоцкай цэнтральнай раённай бальніцы новы галоўны педыятр, калі мы пазнаёміліся, працаваў толькі трэці дзень. Павел Філіпаў пакуль што жыве ў Віцебску, а нарадзіўся ў Сянно. Мама таксама медык, як і айчым. Стаць менавіта дзіцячым урачом вырашыў даўно, таму і вучыўся ў Гродне, дзе ёсць спецыялізаваны факультэт. А мог бы ў сваім абласным цэнтры.

На ўмовы працы не скардзіцца. Ёсць магчымасць працаваць на 1,5 стаўкі. Ці застанецца пасля адпрацоўкі? Сказаў, што яшчэ пра гэта не думаў. У прынцыпе, калі дадуць жыллё, чаму б і не? Ды і зноў жа, да Віцебска каля трыццаці кіламетраў. У багатых краінах свету людзі і сотню змогуць праехаць да добрага месца работы.

Галоўны ўрач установы аховы здароўя «Гарадоцкая ЦРБ» Валерый Самсонаў кажа, што праблем з кадрамі няма. Хапае і ўрачоў, і медыцынскіх сясцёр. Тыя, хто прыязджаюць, могуць разлічваць на ўважлівае стаўленне. Жыллё — першачарговая задача, якая вырашаецца пры дапамозе мясцовай улады.

У раённым цэнтры рамёстваў сярод іншых на пытанні адказала тэхнік Дыяна Ананьева, якая пераехала з Віцебска за мужам-будаўніком. Жанчына — маладая мама, робіць сувеніры, вучыць землякоў рамёствам.

Ганна Шалаева кіруе гуртком ганчарства. Летась стала лаўрэатам другой ступені ў намінацыі «Творчы дэбют» на конкурсе «Славянскага базару ў Віцебску». Падабаецца тут усё, «шукаць шчасця» ў абласным цэнтры і яшчэ далей не збіраецца...

А ў рэдакцыі «Гарадоцкага весніка» пагутарылі з карэспандэнткамі Маяй Салдаценкай і Юліяй Прышчэпай. Мая ўжо год як скончыла Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Аркадзя Куляшова. Юля вучылася ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава.

Абаяльныя дзяўчаты пішуць пра ўсё і пра ўсіх. Сказалі, што раёнка — добрая школа для прафесійнага росту. Вочы гарэлі, калі расказвалі пра рэпартажы з палёў, пра тое, як пісалі пра значныя падзеі ў жыцці раёна, творчых людзей і іншае...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
**фота аўтара.**

ПРЫЯРЫТЭТЫ

# Укладзенае вернецца

**КАЛЯ 2,7 мільёна рублёў толькі сёлета было выдаткавана з абласнога бюджэту на рэканструкцыю Віцебскага абласнога палаца дзяцей і моладзі. На куплю абсталявання патрацілі каля паловы мільёна рублёў.**



На святочнай прэзентацыі аб'екта адукацыі (корпуса, які на праспекце Фрунзэ) губернатар Мікалай Шарснёў нагадаў, што ў 2018 годзе капітальны рамонт быў зроблены ў першым корпусе ўстановы. Ён знаходзіцца недалёка ад галоўнай сцэнічнай пляцоўкі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Той будынак быў узведзены ў першую пяцігодку пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

Два гады таму было прынята рашэнне адрамантаваць і корпус пазнейшай пабудовы (другой паловы 1960-х). Будаўнікі зрабілі тут усё неабходнае за дзевяць месяцаў.

Мікалай Шарснёў падкрэсліў, што дзеля шчаслівага дзяцінства ўлада не шкадуе грошай. Фраза «Усё найлепшае — дзецям» была і застаецца актуальнай. Стварэнне добрых умоў для вучобы і цікавага баўлення вольнага часу, карыснага для інтэлекту і здароўя, — інвестыцыя ў будучыню, адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці.

Выдаткі акупляюцца прызамі, дыпломамі, медалямі... Яны — пацвярджэнне таго, што ўсё робіцца правільна.



Колькасць тых, хто можа развіць тут свае таленты, уражвае: у Віцебскім абласным палацы дзяцей і моладзі арганізавана работа 416 аб'яднанняў па інтарэсах. І ў іх займаюцца больш за 4000 навучэнцаў! Калі задумацца, насельніцтва цэлага пасёлка, нават райцэнтра. З імі працуюць каля 190 педагагічных работнікаў, з іх 130 педагогаў дадатковай адукацыі (больш за 60 % маюць адпаведную кваліфікацыйную катэгорыю). У палацы сем структурных падраздзяленняў. Апроч іншых ёсць аддзелы турызму і краязнаўства, экалагічны, тэхнічнай творчасці.

Дзякуючы новым умовам у найбліжэйшай перспектыве — адкрыццё новых кірункаў дзейнасці. Безумоўна, у эпоху віртуальных тэхналогій асабліва інтарэс у юных гараджан выклікае ўсё, што звязана з IT, стварэннем робатаў, інтэрнэтам... Кіраўніцтва ўстановы, улічваючы гэты фактар, ужо сёння гатова прапанаваць тое, што будзе вельмі запатрабавана ў будучыні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Алега КЛІМОВІЧА.**

НА СВАІМ МЕСЦЫ

# РАБОТА, ЗАРПЛАТА, ЖЫЛЛЁ

## Тры складнікі паспяховага развіцця

**ВЁСКА з кожным годам страчвае ўсё больш людзей. Ажывіць сельскую мясцовасць, удыхнуць у яе новае жыццё могуць маладыя кадры. Што робяць у Мінскай вобласці, каб прыцягнуць іх і замацаваць на зямлі?**



Падрыхтоўка кадраў для сельскагаспадарчай вытворчасці рэгіёна вядзецца ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце, Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны, Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце і чатырох сельскагаспадарчых каледжах, размешчаных на Міншчыне.

### Няма жылля — няма кадраў

Каб заахвоціць школьнікаў да паступлення ва ўстановы адукацыі сельскагаспадарчага профілю, у школах кожнага раёна ладзяцца семінары, круглыя сталы з удзелам прадстаўнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі, кіраўнікоў і спецыялістаў сельскагаспадарчых арганізацый. Апошнія, а таксама прадстаўнікі аблсельгасхарчу прысутнічаюць на размеркаванні выпускнікоў. З кожным з іх праводзіцца індывідуальная гутарка. З улікам іх пажаданняў адбываецца адбор для далейшага накіравання на работу ў гаспадаркі цэнтральнага рэгіёна.

Як сказалі ў камітэце па сельскай гаспадарцы і харчаванні, сёлета ў сельскагаспадарчыя арганізацыі па размеркаванні накіравана 558 маладых спецыялістаў, у тым ліку 174 выпускнікі з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія навучаліся на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Чакаецца, што прыбудзе 216 маладых спецыялістаў зоаветэрынарнага, 62 — аграномічнага і 214 — інжынернага профілю. На месцах разумеюць, што моладзь цікавяць не толькі належныя ўмовы працы, але і жыллёвыя. Таму ў першую чаргу імкнуцца забяспечыць ім дах над галавой. У прыватнасці, летась 43 спецыялістам былі выдзелены дамы, 38 — кватэры, 166 — інтэрнат, а 289 жывуць з бацькамі.

Вядома, у пачатку прафесійнай кар'еры моладзь падтрымліваюць і матэрыяльна. У прыватнасці, у сельгасарганізацыях усім маладым спецыялістам налічваецца даплата да заработнай платы на працягу двух гадоў работы ў памеры 0,46 базавай стаўкі, устаноўленай урадам для аплаты працы работнікаў бюджэтнай сферы. Спецыялістам, якія працягваюць па заканчэнні двух гадоў з дня прыбыцця на работу працоўныя адносіны з сельскагаспадарчымі арганізацыямі, на працягу наступных трох гадоў з рэспубліканскага бюджэту даецца даплата да іх заработнай платы ў памеры 0,69 базавай стаўкі, якая ўстанаўліваецца Саветам Міністраў для аплаты працы работнікаў бюджэтных і іншых арганізацый, што атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыроўнены па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый. Гэта прадугледжвае Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 чэрвеня 2013 года № 353 «Аб некаторых мерах па забеспячэнні арганізацый аграпрамысловага комплексу кадрамі». Са зменамі (у рэд. указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23.03.2016 № 105, ад 18.10.2019 № 386).

— У пагадненні, заключаным паміж камітэтам па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінаблвыканкама, Мінскім абласным камітэтам прафсаюза работнікаў АПК і Мінскім абласным аграпрамысловым саюзам прадугледжаны раздзел «Сацыяльная абарона моладзі». Ён складаецца з дваццаці пунктаў і падпунктаў. З улікам таго, што адной з прычын адтоку кадраў з сельскай мясцовасці з'яўляецца адсутнасць добраўпарадкаванага жылля, пагадненнем прадугледжана выдзяляць жыллё ў першую чаргу маладым спецыялістам, якія прыбылі ў арганізацыі па размеркаванні, а таксама запрошаным. Акрамя таго — даваць маладым сем'ям пры наяўнасці сродкаў з фонду арганізацыі доўгатэрміновыя льготныя або беспрацэнтныя крэдыты на будаўніцтва жылля і набыццё прадметаў працяглага карыстання для хатняга ўжытку, — расказала **намеснік старшыні Мінскай абласной арганізацыі прафсаюза работнікаў АПК Аксана БЕЛЬСКАЯ.**

### Не толькі абавязкі, але і правы

У пастаянную практыку работы прафсаюза ўвайшлі абласныя спаборніцтвы на ўборцы ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур. Умовамі спаборніцтва прадугледжаны прызавыя месцы для маладзёжных экіпажаў камбайнераў, а таксама для маладых кіроўцаў, якія ажыццяўляюць перавозку збожжа ад камбайнаў. Навучэнцам, якія атрымліваюць прафесійную адукацыю і знаходзяцца на прафсаюзным абслугоўванні Мінскай абласной прафсаюзнай арганізацыі, устаноўлена 24 стыпендыі на кожны семестр навучальнага года. Ім ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаюць пасведчанні стыпендыята, а бацькам дасылаюць лісты падзякі.

Мінскі абласны камітэт прафсаюза работнікаў АПК штогод праводзіць форум маладых спецыялістаў. За гэтыя гады яго ўдзельнікамі сталі каля 600 чалавек. Такія мерапрыемствы даюць магчымасць пазнаёміцца з калегамі, абмеркаваць праблемы, адказаць на пытанні, падзяліцца вопытам. Падчас форуму праводзіцца анкетаванне. Гэта дапамагае даведацца, што ў першую чаргу хвалюе моладзь.

**Як высветлілася, асноўнымі прычынамі сыходу маладых спецыялістаў з сельскай гаспадаркі з'яўляюцца нізкі ўзровень заробатнай платы, рэжым рабочага дня, адсутнасць паўнацэнных выхадных, фізічная і псіхалагічная напружанасць працы.**

Вядома, маладыя спецыялісты павінны ведаць не толькі свае абавязкі, але і правы. Маладзёжным саветам Мінскага абласнога камітэта прафсаюза работнікаў АПК былі распрацаваны і раздадзены метадычныя рэкамендацыі «Правы і гарантыі маладых спецыялістаў». Інфармацыйны матэрыял падрыхтаваны на падставе дзеючых у Рэспубліцы Беларусь нарматыўных прававых актаў.

Формы падтрымкі моладзі розныя. Згодна з калектыўнымі дагаворамі, маладым спецыялістам робіцца аднаразовая выплата ў памеры пяці базавых велічынь пры прызыве работніка — члена прафсаюза на службу ва Узброеныя Сілы Беларусі і па вяртанні на ранейшае месца работы.

У Чэрвеньскім раёне ў дзесяці калектыўных дагаворах арганізацый аграпрамысловага комплексу ёсць нормы аб штомесячных кампенсацыйных выплатах выпускнікам, размеркаваным (накіраваным), пераразмеркаваным на работу па-за пастаянным месцам жыхарства і забяспечаным наймальнікам жылымі памяшканнямі. Выплаты на гэтых падставах робяцца ў адкрытых акцыянерных таварыствах «Раванічы», «Чэрвеньскі райагрысэрвіс», «Валевачы».

На месцах работа з моладдзю ажыццяўляецца праз Саветы маладых спецыялістаў. Менавіта яны вывучаюць пытанні эфектыўнасці і арганізацыі работы з гэтай катэгорыяй грамадзян у арганізацыях і на прадпрыемствах, арганізуюць злёты, творчыя і спартыўныя мерапрыемствы, тэматычныя вечары адпачынку, турыстычныя паходы, штогадовыя сустрэчы з кіраўніцтвам раёна і вобласці.

Што да звальнення маладых спецыялістаў пасля абавязковай адпрацоўкі, то яно, як правіла, назіраецца ў гаспадарках з нізкім узроўнем эканамічнага развіцця. У паспяховых арганізацыях пытанні з замацаваннем выпускнікоў устаноў адукацыі ўзнікаюць рэдка. Больш ахвотна застаюцца маладыя людзі, якія накіроўваюцца па размеркаванні ў родныя мясціны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

### ❍ У ТЭМУ

**Падчас сустрэчы старшыні Мінаблвыканкама Аляксандра ТУРЧЫНА з бізнес-супольнасцю цэнтральнага рэгіёна падымаліся пытанні замацавання кадраў, у тым ліку і ў сельскай мясцовасці. Напрыклад, дырэктар агракамбіната «Колас» Стаўбцоўскага раёна Аляксандр Скрыпко канстатаваў, што даводзіцца завозіць на работу каля 200 чалавек з іншых рэгіёнаў. У перспектыве ў Стоўбцах, мяркуецца, узнікне свабодная эканамічная зона або нешта накont тэрытарыяльнага гаспадарчага аб'яднання. Як яны будуць забяспечвацца працоўнымі рэсурсамі?**

**Як адзначыў Аляксандр Турчын, паспяховае развіццё прадпрыемстваў, сельгасарганізацый залежыць ад трох складнікаў: узроўню заработнай платы, правільнага графіка работы з выхаднымі днямі і наяўнасці жылля. Таму да тэмы будаўніцтва жылля варта вярнуцца. Гэта можа быць індывідуальнае або «разумнае» шматкватэрнае жыллё, магчыма, з прыцягненнем ільготных банкаўскіх крэдытаў. «Таму цяпер думаем над гэтым», — адзначыў губернатар. Як варыянт — узводзіць жыллё могуць і самі прадпрыемствы за свой кошт пад дзяржаўныя гарантыі нейкіх ільгот і прэферэнцый. Акрамя таго, маладых спецыялістаў неабходна замацоўваць добрымі заробкамі — напрыклад, на працягу двух-трох гадоў знізіць падатковыя налічэнні з зарплаты.**

# Калі следчы завітаў да вас у хату...

**СЛЕДЧЫЯ Гомельшчыны даказваюць, наколькі дзейснымі могуць стаць нестандартныя формы работы.**

Незвычайны сацыяльны праект арганізавалі прадстаўнікі «Саюза следчых» Гомельскай вобласці. Разам са спецыялістамі самых розных адказных структур і прадстаўнікамі мясцовых уладаў яны наведваюць малыя населеныя пункты. Так можна лепш ацаніць жыццё людзей у глыбінцы і праблемы, з якімі яны сутыкаюцца.

Гэтым разам напрамак «Саюза следчых» Гомельшчыны — Жлобінскі раён. Задача — наведаць маланаселеныя пункты Кароткавіцкага сельсавета. Увайсці ў курс справы — як жывуць, дзе працуюць, якія ёсць перспектывы — дапамагае **кіраўнік спраў Кароткавіцкага сельвыканкама Вольга ІСАЕНКА.**

— У Кароткавіцкі сельсавет аб'яднаны шэсць населеных пунктаў, дзе пражывае 981 чалавек. З іх амаль 200 дзяцей, — тлумачыць Вольга Аляксееўна.

Цэнтр сельсавета — аграгарадок Кароткавічы — вёска, якую ў 1943 годзе, адступаючы, фашысты зруйнавалі з зямлёй. Мясцовых з Кароткавічаў сагналі ў тую самую вёсачку Ала на Светлагоршчыне, якая стала цяпер сімвалам народнай памяці Беларусі.

Між тым мэта ўдзельнікаў місіі «Саюза следчых» — сустрэцца з мясцовымі жыхарамі ў самых маленькіх, аддаленых вёсачках сельсавета.


У гасцях у пенсіянеркі з вёскі Дубрава.

Накіроўваюцца на адну з малочнатаварных фермаў сельгаспрадпрыемства «Агра-Кароткавічы». Працоўны дзень у самым разгары, работнікі гаспадаркі наведвальнікаў не чакалі. Спачатку крыху саромеюцца такой увагі, але, асвоіўшыся ў размове, тлумачаць, як жывецца ды працуецца на вёсцы.

— Для нас вельмі важна, каб жыхары малых сельскіх населеных пунктаў бачылі ў нас не высокіх гасцей з вобласці, а памочнікаў у вырашэнні жыццёвых праблем, — выказвае сваю пазіцыю **намеснік начальніка ўпраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці, старшыня «Саюза следчых» Аркадзь ТРАЦЦЯКОЎ.** Менавіта Аркадзь Валер'евіч ініцыяваў і наладзіў такую нестандартную форму работы з вясковымі жыхарамі.

Працаўнікі гаспадаркі зацікаўлены незвычайным кірункам работы следчых, пытаюцца, дзе больш падрабязна пачытаць аб грамадскім аб'яднанні «Саюз следчых». Потым прымаюць прапанову ад супрацоўнікаў раённай арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа і выкарыстоўваюць магчымасць атрымаць кансультацыю па пытаннях здароўя — вымераць артэрыяльны ціск, тэмпературу, сатурацыю (узровень насычанасці крыві кіслародам). Дапамагаюць у гэтым вяскоўцам удзельнікі акцыі — начальнік аддзела Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Арцём Карпенка і медыцынская сястра, валанцёр медыка-сацыяльнай службы «Дапамога» Наталля Кушнярова.

У незвычайным туры па раёне гомельскіх следчых падтрымалі таксама супрацоўнікі Жлобінскага філіяла Гомельскага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры. Пытанні да гэтых спецыялістаў звычайна адны з самых папулярных у спісе запытаў ад вяскоўцаў.

Наступны пункт — вёска Плесавічы. Кіраўнік сельвыканкама расказвае, у якіх дамах пражываюць адзінокія пенсіянеры, інваліды — гэтым людзям асабліва патрэбна падтрымка і дапамога.

Жыхарка Плесавічаў, інвалідкалясачнік Таццяна Мікалаеўна Іванова ў размове са следчымі просіць разабрацца, ці можна з райцэнтра дастаўляць лекі, што выпісваюцца па рэцэптах.

— Я ж не адна такая ў вёсцы, у нас шмат старых за 80 гадоў, а трэба шукаць, як дабрацца да райбальніцы, каб атрымаць лекі бясплатна, — дзеліцца пенсіянерка.

Жанчына звяртае ўвагу і на тое, што ў іх вёсцы няма магазіна.

Іншыя вяскоўцы, якія сустракаюць гасцей на вуліцы, узнімаюць пытанне водазабеспячэння. У цэнтры сельсавета — аграгарадку Кароткавічы — не так даўно адкрылася новая станцыя абезжалезвання. Тут, у Плесавічах, многія людзі карыстаюцца вадой калодзежнай.

Гомельскія следчыя бяруць на даследаванне ваду са студні. Дапаможа зрабіць аналіз спецыяліст Гомельскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Настасся Дзям'янцава, якая таксама прыехала ў Жлобінскі раён у складзе групы.


Вымярэнне артэрыяльнага ціску ў жыхара вёскі Плесавічы.

Удзельнікі акцыі завіталі на падворак пенсіянера Анатоля Канстанцінавіча Запольскага. Мужчына, які размяняў дзявяты дзясятак, жыве адзін, але дзеці ды ўнукі наведваюць старога часта. Яны і паднялі пытанне, ці магчыма аформіць ва ўласнасць незанятую зямлю каля бацькоўскага агарода, якую па сваёй ініцыятыве апрацоўваюць, бо зарастае бур'янам.

Усе тлумачэнні дала спецыяліст Жлобінскага філіяла Гомельскага агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры Вольга Шульга.

Увогуле ў даверальных гутарках са следчымі вяскоўцы дзяліліся сваімі жыццёвымі гісторыямі, некаторыя прасілі параіць, як вырашыць побытавыя праблемы. Камусьці былі неабходны медыцынская і юрыдычная кансультацыі, хтосьці прасіў дапамагчы працаўладкаваць дарослых, але не зусім самастойных дзяцей, якія перабіваюцца рэдкімі падпрацоўкамі, часцяком выпіваюць і не заўжды сябруюць з законам.

Усе пытанні і прапановы, у тым ліку тыя, што не адносяцца да кампетэнцыі следчых, прынятыя да выканання.

— Не сакрэт, што ўзровень прававой культуры ў аддаленых населеных пунктах не самы высокі. Няхай сёння хапае крыніц для атрымання інфармацыі, але жыхары вёсак, асабліва пажылога ўзросту, могуць штосьці недачытаць, недачуць, няправільна зразумець. Наша задача — забяспечыць іх неабходнай інфармацыяй і высветліць, якую дапамогу мы можам аказаць гэтым людзям, — падкрэсліў Аркадзь Траццякоў.

Напрыканцы акцыі ў аграгарадку Кароткавічы быў арганізаваны сельскі сход. Акрамя інфармацыйнай групы, з мясцовымі жыхарамі сустрэліся начальнік УСК па Гомельскай вобласці Сяргей Удовікаў, начальнік Жлобінскага РАСК Павел Карась і старшыня Жлобінскага райвыканкама Іван Навуменка.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**


Старшыня «Саюза следчых» Гомельскай вобласці Аркадзь ТРАЦЦЯКОЎ і Наталля КУШНЯРОВА ў гасцях у жыхаркі вёскі Дубрава.

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2020.Б.002.000016**

**Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов», УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска**

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

| № лота | Наименование | Начальная цена без НДС, руб. | Минимальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Мельница высокопроизводительная SMMC ALFA, инв. № 501348 | 51 500,00 | 36 050,00 |
| 2 | Виброгрохот двухэтажный ALFA, инв. № 501347 | 42 100,00 | 29 470,00 |
| 3 | Барабан первичного измельчения RZ01, инв. № 501817 | 34 100,00 | 23 870,00 |
| 4 | Металлоискатель, инв. № 501350 | 38 700,00 | 27090,00 |
| 5 | Питатель в-2000 с бункером, инв. № 501317 | 49 300,00 | 34 510,00 |
| 6 | Питатель ленточный ЯСМК-488, инв. № 501354 | 36 400,00 | 25 480,00 |
| 7 | Транспортер, инв. № 501343 | 16 900,00 | 11 830,00 |
| 8 | Просеивающее устройство ALFA, инв. № 501344 | 5 100,00 | 3 570,00 |
| 9 | Манипулятор гидравлический М-75, инв. № 501358 | 17 800,00 | 12 460,00 |
| 10 | Питатель В-800, инв. № 501399 | 27 300,00 | 19 110,00 |
| 11 | Распределительный шнек, инв. № 501349 | 6 700,00 | 4 690,00 |
| 12 | Транспортер пластинчатый, инв. № 501357 | 2 300,00 | 1 610,00 |
| 13 | Транспортер подачи поризатора L= 26 м, инв. № 501294 | 18 700,00 | 13 090,00 |
| 14 | Конвейер ленточный В – 500, инв. № 501509 | 1 900,00 | 1 330,00 |
| 15 | Возвратный шнек, инв. № 501345 | 6 400,00 | 4 480,00 |
| 16 | Транспортер подачи поризатора L= 16 м, инв. № 501316 | 6 300,00 | 4 410,00 |
| 17 | Транспортер подачи поризатора L 8 м, инв. № 501295 | 2 500,00 | 1 750,00 |
| 18 | Конвейер В-800, инв. № 501298 | 3 900,00 | 2 730,00 |
| 19 | Транспортер подачи поризатора L 6 м, инв. № 501296 | 2 000,00 | 1 400,00 |
| 20 | Аспирационная установка FT-504, инв. № 501352 | 2 000,00 | 1 400,00 |
| 21 | Аспирационная установка FT-504, инв. № 501353 | 2 000,00 | 1 400,00 |
| 22 | Аспирационная установка FT-502, инв. № 501351 | 1 700,00 | 1 190,00 |
| 23 | Пресс испытательный ИП-2500М, инв. № 501359 | 35 600,00 | 24 920,00 |
| 24 | Станок токарно-винторезный GH20120 ZH, инв. № 501480 | 21 119,18 | 14 783,43 |
| 25 | Станок консольно-фрезерный универсальный, инв. № 500898 | 24 824,30 | 17 377,01 |
| 26 | Прессовая группа (Пресс шнековый MAGNA 675), инв. № 501700 | 628 017,84 | 439 612,49 |
| 27 | Экструдер VAP65, инв. № 501108 | 615 049,92 | 430 534,94 |
| 28 | Резательное устройство тип A-UV, инв. № 501105 | 89 663,90 | 62 764,73 |
| 29 | Робот садки с захватом, инв. № 501706 | 231 570,00 | 162 099,00 |
| 30 | Робот садки с захватом, инв. № 501707 | 231 570,00 | 162 099,00 |
| 31 | Сушильный барабан, инв. № 501257 | 105 040,15 | 73 528,11 |
| 32 | Древорубка ALFA, инв. № 501346 | 47 240,28 | 33 068,20 |
| 33 | Вакуумный насос для прессовой группы C S6/18.5VFA, инв. № 501675 | 25 565,33 | 17 895,73 |

Оборудование, бывшее в употреблении.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения: нет.

**Дата и время начала и завершения электронных торгов: 17.09.2020 с 9.00 до 16.00.**

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by.

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток **в срок до 16.00 16.09.2020.**

**Задатки: по лоту № 1** в сумме 5150,00 (пять тысяч сто пятьдесят рублей), **по лоту № 2** в сумме 4210,00 (четыре тысячи двести десять рублей), **по лоту № 3** в сумме 3410,00 (три тысячи четыреста десять рублей), **по лоту № 4** в сумме 3870,00 (три тысячи восемьсот семьдесят рублей), **по лоту № 5** в сумме 4930,00 (четыре тысячи девятьсот тридцать рублей), **по лоту № 6** в сумме 3640,00 (три тысячи шестьсот сорок рублей), **по лоту № 7** в сумме 1690 (одна тысяча шестьсот девяносто рублей); **по лоту № 8** в сумме 510,00 (пятьсот десять рублей), **по лоту № 9** в сумме 1780,00 (одна тысяча семьсот восемьдесят рублей), **по лоту № 10** в сумме 2730,00 (две тысячи семьсот тридцать рублей), **по лоту № 11** в сумме 670,00 (шестьсот семьдесят рублей), **по лоту № 12** в сумме 230,00 (двести тридцать рублей), **по лоту № 13** в сумме 1870 (одна тысяча восемьсот семьдесят рублей), **по лоту № 14** в сумме 190,00 (сто девяносто рублей), **по лоту № 15** в сумме 640,00 (шестьсот сорок рублей), **по лоту № 16** в сумме 630,00 (шестьсот тридцать рублей), **по лоту № 17** в сумме 250,00 (двести пятьдесят рублей), **по лоту № 18** в сумме 390,00 (триста девяносто рублей), **по лоту № 19** в сумме 200,00 (двести рублей), **по лоту № 20** в сумме 200,00 (двести рублей), **по лоту № 21** в сумме 200,00 (двести рублей), **по лоту № 22** в сумме 170,00 (сто семьдесят рублей), **по лоту № 23** в сумме 3 560,00 (три тысячи пятьсот шестьдесят рублей), **по лоту № 24** в сумме 2 111,91 (две тысячи сто одиннадцать рублей 91 копейка), **по лоту № 25** в сумме 2 482,43 (две тысячи четыреста восемьдесят два рубля, 43 копейки), **по лоту № 26** в сумме 62 801,78 (шестьдесят две тысячи восемьсот один рубль, 78 копеек), **по лоту № 27** в сумме 61 504,99 (шестьдесят одна тысяча пятьсот четыре рубля, 99 копеек), по **лоту № 28** в сумме 8 966,39 (восемь тысяч девятьсот шестьдесят шесть рублей, 39 копеек), **по лоту № 29** в сумме 23 157,00 (двадцать три тысячи сто пятьдесят семь рублей), **по лоту № 30** в сумме 23157,00 (двадцать три тысячи сто пятьдесят семь рублей**),** **по лоту № 31** в сумме 10 504,01 (десять тысяч пятьсот четыре рубля, 01 копейка), **по лоту № 32** в сумме 4 724,02 (четыре тысячи семьсот двадцать четыре рубля, 02 копейки), **по лоту № 33** в сумме 2 556,53 (две тысячи пятьсот пятьдесят шесть рублей, 53 копейки) должны быть зачислены на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

Справочная информация:

Контактный телефон антикризисного управляющего: +375 17 256 23 93.

Контактный телефон для осмотра объектов: + 375 (44) 793 63 23.

Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 42-60-11, 8 (029) 884-96-79.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) **с 17.08.2020 по 16.09.2020 с 09.00 до 17.00** по месту нахождения имущества по предварительному согласованию.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат и прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н. С., извещает о проведении**
**25 августа 2020 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 70 %**
**в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8 | | | |
| 2 | Настольно-сверлильный станок ГС2116К, инв. № 61343 | **1 500,00** | 150,00 |
| 3 | Станок 4К722АФ-1, инв. № 50372 | **1 890,00** | 189,00 |
| 4 | Кран-балка электрическая г/п 2тн, инв. № 50132 | **720,00** | 72,00 |
| 5 | Кран-балка, г/п 1тн, инв. № 50117 | **510,00** | 51,00 |
| 6 | Стенд для испытаний коллектора центрального 130.00-52.00.9000, инв. № 60943 | **5 010,00** | 501,00 |
| 7 | Котел водогрейный КВ-1, инв. № 60552 | **3 690,00** | 369,00 |
| 8 | Толщиномер Mikrogage II, инв. № 60702 | **420,00** | 42,00 |
| 9 | Системный блок Sempron 2.8 (констр. отдел), инв. № 60678 | **66,00** | 6,60 |
| 10 | Платежный электронный мобильный терминал IWL.220 GPRS, инв. № 61399 | **174,00** | 17,40 |
| 11 | Стенд для сборки двутавровых балок, инв. № 10038 | **7 170,00** | 717,00 |
| 12 | Станок продольно-фрезерный 6М616 Ф 11.20.3, инв. № 60915 | **200 130,00** | 20 013,00 |
| 13 | Установка для грибовидности балок, инв. № 61421 | **5 250,00** | 525,00 |
| 14 | Блок модуля (6,0*2.4*2.5), инв. № 61351 | **870,00** | 87,00 |
| 15 | Станов для резки брусков, инв. № 605 | **99,00** | 9,90 |
| 20 | Профильно-шлифовальный станок 395М, инв. № 50015 | **1 350,00** | 135,00 |
| 22 | Станок заточной 3К-634, инв. № 50392 | **390,00** | 39,00 |
| 23 | Станок 1В340Ф30, инв. № 50378 | **2 910,00** | 291,00 |
| 24 | Станок 1В340Ф30 инв. № 50374 | **2 070,00** | 207,00 |
| 25 | Станок мод.1В310Ф30, инв. № 50368 | **2 910,00** | 291,00 |
| 26 | Станок мод.1В310Ф30, инв. № 50365 | **2 490,00** | 249,00 |
| 27 | Станок токарно-винторезный НВ340Ф30, инв. № 50390 | **2 070,00** | 207,00 |
| 28 | Станок ГПМ 16А20Ф3РМ-139, инв. № 50359 | **2 880,00** | 288,00 |
| 29 | Станок ГПМ 16А20Ф3С-139, инв. № 50354 | **2 070,00** | 207,00 |
| 30 | Станок радиально-сверлильный ГС 545, инв. № 60978 | **6 150,00** | 615,00 |
| 32 | Станок токарно-револьверный 1П-365, инв. № 50084 | **1 410,00** | 141,00 |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Школьная, 8. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович. Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 14 августа 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 21 августа 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

**В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **30 (тридцати) рабочих дней** и произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607). Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от **27.09.2019 г. № 184 (29051). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**



ПАКУЛЬ НЕ ПОЗНА

# ПАЖАР У ВЯСКОВЫМ ДОМЕ

**СЁЛЕТА за сем першых месяцаў у прысталічнай вобласці адбылося 769 пажараў. З іх на долю жылых дамоў прыйшлося 295. Працэнт высокі — больш за траціну. Загінулі 34 чалавекі.**



Па якіх жа прычынах гараць жылыя дамы? Пра гэта мы распыталі **афіцыйнага прадстаўніка Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Дзіяну ЖАЛЯЗНЯК.**

— Так, пытанне пажараў у жылых дамах у нашым рэгіёне вельмі вострае. Вобласць мае шэраг асаблівасцяў, калі параўноўваць з іншымі рэгіёнамі. Мінршчына лідзіруе па колькасці сельскага насельніцтва, да таго ж у нас вельмі шмат садовых таварыстваў і дамоў, якія выкарыстоўваюцца ў якасці дач.

— Датычна летніх дамкоў існуе адна асаблівасць. Напрыклад, у кватэры, дзе чалавек жыве пастаянна, камунікацыі, як правіла, знаходзяцца ў лепшым стане — за той жа праводкай хоць мінімальна, але сочаць. Што да дач, то ўсё наадварот. Мы не раз сутыкаліся з меркаваннем: маўляў, «на адзін раз хопіць». А калі не хопіць? Да таго ж у «ганаровую ссылку» ў летнія дамкі адпраўляюцца старыя электрапрыборы, якія даўно адпрацавалі закладзены заводам-вытворцам рэсурс для іх бяспечнай эксплуатацыі. Нарэшце, чым бліжэй да восені, тым больш актуальная праблема выкарыстання пячнога абсталявання. Па традыцыі крытычны момант — старт ацяпляльнага сезону, ды і ў жніўні ўжо могуць быць халодныя ночы.

Таму ратавальнікі раяць заняцца аглядам печы ўжо зараз, калі на дварэ яшчэ захоўваецца летняе цяпло. Гэта неабходна, каб элементарна выйграць час і ліквідаваць узніклыя праблемы, пакуль яшчэ не позна. Пры першым жа паленні свежапабеленая печ высвеціць усе трэшчыны, як на фотаздымку. Ды і комін таксама прачысціць не пашкодзіць.

**— Мы просім сваякоў старых людзей дапамагчы зрабіць ім усю неабходную работу за жнівень, максімум — верасень, — адзначае Дзіяна Жалязняк. — Адзінокім людзям гатовы прыйсці на дапамогу ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.**

І сапраўды, цягнуць да апошняга не варта, бо сінаптычная абстаноўка ў нас пераменлівая і істотнае пахаладанне можа адбыцца ў любы час.

Але асноўная прычына пажараў у жылых дамах — гэта неасцярожнае абыходжанне з агнём (129 з 295 пажараў). Прычым 85 прыпадае на долю неасцярожнага курэння. Звычайна гэта адбываецца па адной і той жа схеме — чалавек вырашыў пакурыць перад сном у ложку (і не заўжды ў цвярозым стане), непрыкметна для сябе заснуў, цыгарэта вывалілася з рук і пачала пакрысе прапальваць тканіну...

— Калі тое ж прывядзенне электраправодкі ў належны стан можа пацягнуць значныя матэрыяльныя выдаткі, то не дапусціць курэння ў ложку здольны кожны, хто мае такую звычку, — мяркуе Дзіяна Жалязняк. — Нават даросламу чалавеку дастаткова літаральна пары ўдыхаў дыму, каб страціць прытомнасць. Час на выратаванне яго мінімальны...

Пры гэтым уратавацца дапаможа аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Так адбылося ў Заслаўі. У адной з кватэр, дзе жыве шматдзетная сям'я, раптам узнікла задымленне. Бацька пачуў, што апавяшчальнік спрацаваў, і хуценька вывеў усю сям'ю з кватэры. Дзякуючы гэтаму яны ацалелі. Агонь пашкодзіў перакрыцці столі, закурыў сцены і маёмасць.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# На Блакітнай крыніцы

**ГІДРАЛАГІЧНЫ помнік прыроды ў Слаўгарадскім раёне запрашае на свята Макаўя, у госці да Блакітнай крыніцы.**

Адпачыць, пакаштаваць смачнага мёду і напіцца гаючай крынічнай вады — усё гэта будзе магчыма каля Блакітнай крыніцы. Праграма чакаецца вельмі насычаная і разнастайная. Будуць працаваць спартыўна-гульнявыя пляцоўкі, экскурсіі каля крыніцы і па Слаўгарадскім раёне, гандлёвыя пункты і атракцыёны.

Далёка за межамі Слаўгарада ведаюць пра надзвычай смачныя вырабы мясцовых сыravараў. Можна будзе не толькі іх набыць, але і навучыцца рабіць самастойна. А вось пра тое, што смачны не толькі слаўгарадскі сыр, але і мёд, мала хто ведае. Пераканацца ў гэтым запрашае ўніверсальны кірмаш «Мядовы Спас», дзе мясцовыя пчаляры прапануюць не толькі мёд, але і розныя каштоўныя для здароўя і настрою вырабы пчалярства. Шмат чаго цікавага і карыснага можна будзе паглядзець і набыць на выстаўцы-продажы прамысловых і харчовых тавараў беларускіх вытворцаў. А яшчэ наведвальнікаў чакаюць майстар-класы, экскурсіі, захапляльныя падарожжы. Арганізатары запрашаюць узяць удзел у велапаходах па маршрутах ад крыніцы да вёскі Крамянка, а таксама да вёсак Благадаць і Дубна. Тут сёння рэалізуецца шмат розных праектаў, з якімі будзе цікава азнаёміцца больш дэталёва на тэматычных пляцоўках. «Гастранамічная крама», «Кола жыцця», «Мабільная школа аўтарскага рамяства», «На шляху сельскага прадпрымальніцтва», «На скрыжаванні густаў» — гэта толькі некаторыя з іх.

Сёлета шлях да крыніцы стаў больш просты і камфортны. Ад Слаўгарада да яе цяпер вядзе добраўпарадкаваная дарога. А мост цераз Сож, які нядаўна быў адкрыты з удзелам Прэзідэнта, дазволіць ацаніць па поўнай праграме ўсю прыгажосць навакольных мясцін.

Але галоўнае ў гэтай падзеі — усё ж такі цудадзейная Блакітная крыніца, якая з'яўляецца месцам паломніцтва людзей з усіх канцоў свету. 13 жніўня тут адбудзецца вячэрняе богаслужэнне, на наступны дзень раніцай — хрэсны ход, а таксама асвячэнне вады і мёду. Менавіта ў гэтыя дні праваслаўныя вернікі адзначаюць пачатак праваслаўнага двухтыднёвага Успенскага посту, які завершыцца 28 жніўня, у дзень Успення Найсвяцейшай Багародзіцы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 13 жніўня 2020 года.**